Голас Радзімы

№ 9 (1683)
5 сакавіка 1981 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



З 23 лютага па 3 сакавіка 1981 года ў Маскве, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў, працаваў чарговы XXVI з'езд КПСС. З дакладам «Справаздача Цэнтральнага Камітэта КПСС XXVI з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і чарговыя задачы партыі ў галіне ўнутранай і знешняй палітыкі» выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў. Даклад кіраўніка Савецкай дзяржавы выклікаў вялікі рэзананс ва ўсім свеце. Асабліва зразумелая і блізкая людзям свету тая яго частка, дзе Л. І. Брэжнеў гаворыць, што няма цяпер больш важнай задачы для ўсіх народаў планеты, чым адстаяць мір на зямлі.

Аб новым пяцігадовым плане, па якім будзе жыць і працаваць наша краіна ў 1981—1985 гадах, расказаў у дакладзе Старшыня Савета Міністраў СССР М. Ціханаў. З'езд выбраў цэнтральныя органы партыі.

На з'езд прыбылі 123 дэлегацыі са 109 краін усіх кантынентаў нашай планеты. Дэлегаты горача віталі гасцей.

НА ЗДЫМКАХ: Масква. Крамлёўскі Палац з'ездаў 23 лютага 1981 года. Прэзідыум XXVI з'езда КПСС. На трыбуне — Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. БРЭЖНЕЎ; лётчык-касманаўт СССР П. КЛІМУК сярод дэлегатаў; на XXVI з'ездзе КПСС выступіў першы сакратар ЦК КПБ Ц. КІСЯЛЕЎ; XXVI з'езд вітаюць воіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту.

СПРАВАЗДАЧА ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КПСС XXVI З'ЕЗДУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА І ЧАРГОВЫЯ ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ Ў ГАЛІНЕ ЎНУТРАНАЙ І ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ

Даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. БРЭЖНЕВА

23 лютага 1981 года

АБ МІЖНАРОДНАЙ ПАЛІТЫЦЫ КПСС

Наша барацьба за ўмацаванне міру, за паглыбленне разрадкі міжнароднай напружанасці — гэта перш за ўсё барацьба за тое, каб забяспечыць савецкаму народу неабходныя знешнія ўмовы для вырашэння стваральных задач, якія стаяць перад ім. Гэтым мы вырашаем і праблему сапраўды сусветнага характару. Бо няма цяпер ні для аднаго народа пытання больш істотнага, больш важнага, чым захаванне міру, чым забеспячэнне найпершага права кожнага чалавека — права на жыццё.

1. РАЗВІЦЦЁ СУСВЕТНАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ СІСТЭМЫ, СУПРАЦОЎНІЦТВА КРАІН САЦЫЯЛІЗМУ

Таварышы!

Усе гэтыя гады партыя, яе Цэнтральны Камітэт, Палітбюро ўдзялялі неаслабную ўвагу ўмацаванню дружбы і супрацоўніцтва з краінамі сацыялізму.

Разам з імі мы будуем новы, сацыялістычны свет, небывалы яшчэ ў гісторыі тып адносін паміж дзяржавамі, пасапраўднаму справядлівых, раўнапраўных, брацкіх.

Іменна ў такім духу складваюцца нашы адносіны з краінамі сацыялістычнай садружнасці — з Балгарыяй, Венгрыяй, В'етнамам, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікай, Кубай, Лаосам, Манголіяй, Польшчай, Румыніяй, Чэхаславакіяй.

Па ўсіх буйных праблемах сацыяльна-эканамічнага развіцця, міжнароднай палітыкі ў нас усталявалася прынцыповае адзінства поглядаў. Гэта — вынік пастаяннага ўзаемадзеяння брацкіх камуністычных партый, наша агульнае дасягненне.

Вельмі важна, што глыбокае ўзаемаразуменне, давер'е і згода існуюць паміж кіраўніцтвам нашых партый.

За гэтыя гады адбылося трыццаць сем дружалюбных сустрэч на вышэйшым узроўні ў Крыме. Без пратакольных фармальнасцей у таварыскай атмасферы мы абмяркоўвалі перспектывы развіцця нашых адносін, вузлавыя праблемы сусветнай палітыкі, намячалі задачы на будучыню. Кожная сустрэча прыносіла нешта новае і карыснае. За гэта добрае супрацоўніцтва хочацца выказаць кіраўнікам брацкіх краін і партый сардэчную ўдзячнасць.

Рэгулярным быў абмен партыйна-ўрадавымі дэлегацыямі. Увайшлі ў практыку нарады сакратароў ЦК па пытаннях міжнародных адносін, ідэалагічнай і арганізацыйна-партыйнай работы.

Мноствам ніцей звязаны партыйныя арганізацыі Савецкага Саюза і краін сацыялістычнай садружнасці. Звязаны на ўсіх узроўнях — ад рэспублік, краёў і абласцей да раёнаў і буйных прадпрыемстваў. Жывы, плённы характар набыло супрацоўніцтва паміж дзяржаўнымі органамі, грамадскімі арганізацыямі, вытворчымі калектывамі. Трывалай нормай сталі духоўныя зносіны, цесныя сувязі ў галіне ідэалогіі і культуры.

Адносіны паміж дзяржавамі здаўна называліся міжнароднымі. Але толькі ў наш час, у свеце сацыялізму, яны сапраўды сталі адносінамі паміж народамі. У іх непасрэдна ўдзельнічаюць мільёны і мільёны людзей. Гэта, таварышы, прынцыповая заваёва сацыялізму, яго вялікая заслуга перад чалавецтвам.

Поле нашага супрацоўніцтва ахоплівае ўсё новыя сферы. Прыклад таму — праграма «Інтэркосмас». Касманаўты брацкіх краін працуюць не толькі для навукі і для народнай гаспадаркі. Яны выконваюць і велізарнага значэння палітычную місію.

У канстытуцыях большасці брацкіх краін падкрэсліваюцца ідэі дружбы і супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам. Гэта — вялікае давер'е да нашай краіны, і мы адказваем тым жа. Новая Канстытуцыя СССР абвяшчае дружбу, супрацоўніцтва, узаемадапамогу з краінамі сацыялізму краевугольным каменем савецкай знешняй палітыкі.

Мінулы перыяд пераканаўча паказаў, якую ўплывовую і дабратворную ролю адыгрывае ў еўрапейскіх, ды і ў цэлым у міжнародных справах дзейнасць Арганізацыі Варшаўскага Дагавора і перш за ўсё яе Палітычнага кансультатыўнага камітэта. Праклаўшы раней дарогу да агульнаеўрапейскай нарады, вышэйшы палітычны орган нашага дагавора на сваіх пасяджэннях у Бухарэсце, у Маскве, у Варшаве выступіў з шэрагам новых ініцыятыў, якія прыцягнулі да сябе шырокую ўвагу ў свеце. Іх галоўная мэта — адстаяць разрадку, надаць ёй энергічны рытм, як гаворыцца, другое дыханне.

У гэтыя гады быў створаны новы орган нашага супрацоўніцтва. Камітэт міністраў замежных спраў. Ужо цяпер можна сказаць, што гэта сябе поўнасцю апраўдала: аператыўнасць узгаднення знешнепалітычных дзеянняў павысілася.

Зладжана вялося будаўніцтва Аб'яднаных Узброеных Сіл. І тут, як заўсёды, добрую работу правёў Камітэт міністраў абароны.

Цэнтральны Камітэт дакладвае з'езду: ваенна-палітычны абарончы саюз краін сацыялізму верна служыць міру. Ён мае ўсё неабходнае для таго, каб надзейна абараніць сацыялістычныя заваёвы народаў. І мы будзем рабіць усё, каб так было і ў далейшым!

Таварышы! Мы далёкія ад таго, каб маляваць карціну сучаснага сацыялістычнага свету аднымі святочнымі фарбамі. Бываюць у развіцці нашых краін і складанасці. Пераход да інтэнсіўнага развіцця эканомікі, рэалізацыі буйных сацыяльных праграм, фарміраванне камуністычнай свядомасці — усё гэта даецца не адразу. Тут патрэбны і час, і нястомныя творчыя пошукі. І, зразумела, неабходна вучыцца адзін у аднаго.

За гады сацыялістычнага будаўніцтва брацкія краіны набылі разнастайны станоўчы вопыт арганізацыі вытворчасці, кіравання, вырашэння народнагаспадарчых праблем.

Вядома, што рашаючы фронт спаборніцтва з капіталізмам праходзіць у сферы эканомікі, гаспадарчай палітыкі. На мінулым з'ездзе мы, як і іншыя брацкія партыі, вызначылі ў якасці першачарговай задачы далейшае паглыбленне сацыялістычнай інтэграцыі на базе доўгатэрміновых мэтавых праграм. Яны закліканы дапамагчы вырашэнню найбольш вострых, жыццёва важных праблем народнай гаспадаркі.

Цяпер гэтыя праграмы ўвасабляюцца ў канкрэтныя справы. Інтэграцыя набірае тэмпы. Практычна ва ўсіх галінах эканомікі, навукі і тэхнікі прыкметны плён спецыялізацыі вытворчасці. Ужо заключана каля 120 шматбаковых і звыш тысячы двухбаковых пагадненняў наконт гэтага. Завяршаецца каардынацыя народнагаспадарчых планаў краін СЭУ на 1981—1985 гады.

Тое, што зроблена краінамі сацыялізму ў эканамічным развіцці, у павышэнні ўзроўню жыцця людзей, — гэта цэлая эпоха.

Апошнія гады былі не самымі спрыяльнымі для народнай гаспадаркі рада сацыялістычных дзяржаў. І ўсё-такі факт, што тэмпы эканамічнага росту членаў СЭУ за дзесяцігоддзе былі ўдвая вышэйшымі, чым у развітых краін капіталу. Члены СЭУ заставаліся групай краін свету, якая найбольш дынамічна развівалася.

КПСС і іншыя брацкія партыі бяруць курс на тое, каб ператварыць наступныя дзве пяцігодкі ў перыяд інтэнсіўнай вытворчай і навукова-тэхнічнай кааперацыі краін сацыялізму.

Само жыццё ставіць задачу — дапоўніць каардынацыю планаў узгадненнем эканамічнай палітыкі ў цэлым. На парадак дня ставяцца і такія пытанні, як збліжэнне структур гаспадарчых механізмаў, далейшае развіццё прамых сувязей паміж міністэрствамі, аб'яднаннямі і прадпрыемствамі, якія ўдзельнічаюць у кааперацыі, стварэнне сумесных фірм. Магчымы і іншыя формы спалучэння нашых намаганняў і рэсурсаў.

Як бачыце, таварышы, тут многа новых буйных праблем. Можа быць, іх было б карысна калектыўна абмеркаваць у недалёкай будучыні кіраўнікам брацкіх краін.

Зразумела, Савецкі Саюз, як і нашы сацыялістычныя партнёры, імкнецца да таго, каб сувязі былі ва ўсіх адносінах узаемавыгаднымі.

Савецкі Саюз атрымлівае з брацкіх краін многія віды машын і абсталявання, транспартныя сродкі, тавары народнага спажывання, асобныя віды сыравіны. У сваю чаргу СССР пастаўляе на сацыялістычны рынак нафту, газ, руду, бавоўну, лес і, зразумела, разнастайную індустрыяльную прадукцыю. За мінулае пяцігоддзе мы атрымалі з краін СЭУ тавараў на суму 90 мільярдаў рублёў, а нашы пастаўкі дасягнулі 98 мільярдаў.

Цяпер немагчыма ўявіць сабе ўпэўненае развіццё той або іншай сацыялістычнай краіны, паспяховае вырашэнне ёю такіх, скажам, праблем, як забеспячэнне энергарэсурсамі і сыравінай, укараненне навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі без сувязей з іншымі брацкімі краінамі.

Праблемы, якія ўзнікаюць у ходзе нашага супрацоўніцтва, мы вырашаем сумесна, шукаем шляхі найбольш правільнага спалучэння інтарэсаў кожнай з брацкіх краін і агульных інтарэсаў. Гэта адносіцца, напрыклад, да ўстанаўлення льготных цэн на нафту, газ і іншыя сыравінныя і прамысловыя тавары, якія краіны — удзельніцы СЭУ пастаўляюць адна адной.

Бываюць і асобныя выпадкі, калі сябры маюць патрэбу ў экстраннай дапамозе. Так было з В'етнамам, які стаў у 1979 годзе ахвярай варварскай агрэсіі Пекіна. СССР і іншыя краіны сацыялістычнай садружнасці ў тэрміновым парадку накіравалі яму прадукты харчавання, медыкаменты, будматэрыялы, паставілі ваенную тэхніку. Так было і з Кампучыяй, датла разбуранай стаўленікамі Пекіна — палпотаўцамі.

Гэта, таварышы, і ёсць сацыялістычны інтэрнацыяналізм на практыцы. Савецкія людзі разумеюць і адабраюць такую пазіцыю.

Усе мы зацікаўлены ў тым, каб сацыялістычны рынак быў здольны задавальняць растучыя патрэбнасці краін нашай садружнасці. І карысць ад дапаўнення гаспадарчых магчымасцей адна адной вымяраецца, вядома, не толькі чыста камерцыйным рахункам. Вырашэнне гэтай задачы патрабуе адказнага падыходу з боку гаспадарнікаў, партыйных работнікаў, глыбокага разумення непарыўнай агульнасці інтарэсаў брацкіх краін.

Мы за развіццё гандлёва-эканамічных адносін і з Захадам. Гэта, дарэчы, адзін з фактараў стабілізацыі міжнародных адносін. Тут, аднак, прыходзіцца ўлічваць і палітыку капіталістычных дзяржаў. Эканамічныя сувязі з намі яны нярэдка спрабуюць выкарыстаць як сродак палітычнага націску. Хіба не аб гэтым гаворыць усякага роду забароны і дыскрымінацыйныя абмежаванні ў гандлі з тымі або іншымі краінамі сацыялізму.

Наогул трэба сказаць, што вырашаць стваральныя задачы ў апошнія гады нашым краінам прыходзіцца ва ўскладніўшыхся ўмовах. Адыгралі сваю ролю пагаршэнне сусветнай эканамічнай кан'юнктуры, рэзкія скачкі цэн. Тармажэнне працэсу разрадкі, навязваемая імперыялізмам гонка ўзбраенняў кладуцца немалым цяжарам і на нас.

Фактам з'яўляецца і прыкметнае абвастрэнне ідэалагічнай барацьбы. Для Захаду яна не зводзіцца да проціборства ідэй. Ён пускае ў ход цэлую сістэму сродкаў, разлічаных на падрыў сацыялістычнага свету, яго разрыхленне.

Імперыялісты і іх памагатыя сістэматычна праводзяць варожыя кампаніі супраць сацыялістычных краін. Яны чарняць і скажаюць усё, што адбываецца ў гэтых краінах. Для іх самае галоўнае — адвярнуць людзей ад сацыялізму.

Падзеі апошняга часу яшчэ і яшчэ раз пацвярджаюць: нашы класавыя праціўнікі вучацца на сваіх паражэннях. Яны дзейнічаюць супраць краін сацыялізму ўсё больш вытанчана і каварна.

Там жа, дзе да падрыўной дзейнасці імперыялізму дабаўляюцца памылкі і пралікі ва ўнутранай палітыцы, узнікае глеба для актывізацыі варожых сацыялізму элементаў. Так адбылося ў брацкай Польшчы, дзе праціўнікі сацыялізму пры падтрымцы знешніх сіл, ствараючы анархію, імкнуцца павярнуць развіццё падзей у контррэвалюцыйным напрамку. Як было адзначана на апошнім пленуме ЦК ПАРП, у Польшчы ўзнікла пагроза асновам сацыялістычнай дзяржавы.

Польскія таварышы цяпер працуюць над тым, каб пераадолець крызісную сітуацыю. Яны імкнуцца павысіць баяздольнасць партыі, умацаваць сувязі з рабочым класам, працоўнымі, распрацоўваюць канкрэтную праграму аздараўлення польскай эканомікі.

Важнай палітычнай падтрымкай для сацыялістычнай Польшчы стала мінулагодняя снежаньская сустрэча кіруючых дзеячаў дзяржаў — удзельніц Варшаўскага Дагавора ў Маскве. Гэта сустрэча паказала ясна: польскія камуністы, польскі рабочы клас, працоўныя гэтай краіны могуць цвёрда спадзявацца на сваіх сяброў і саюзнікаў; сацыялістычную Польшчу, брацкую Польшчу мы ў бядзе не пакінем і ў крыўду не дадзім!

Падзеі ў Польшчы зноў пераконваюць, як важна для партыі, для ўмацавання яе кіруючай ролі чутка прыслухоўвацца да голасу мас, рашуча змагацца з усякімі праяўленнямі бюракратызму, валюнтарызму, актыўна развіваць сацыялістычную дэмакратыю, праводзіць узважаную рэалістычную палітыку ў знешнеэканамічных сувязях.

Гісторыя сусветнага сацыялізму ведае ўсякія выпрабаванні. Былі ў ёй і складаныя, і крызісныя моманты. Але камуністы заўсёды смела сустракалі атакі праціўніка і перамагалі. Так было і так будзе. І няхай ніхто не сумняваецца ў нашай агульнай рашучасці забяспечыць свае інтарэсы, абараніць сацыялістычныя заваёвы народаў!

Мы змагаемся за справядлівую справу міру і бяспекі народаў, за інтарэсы людзей працы. На нашым баку — праўда марксісцка-ленінскага вучэння. Наша сіла — у адзінстве і згуртаванасці.

На мінулым з'ездзе гаварылася аб тым, што ідзе працэс збліжэння сацыялістычных дзяржаў. Гэты працэс працягвае развівацца. Але ён не сцірае нацыянальнай спецыфікі, гістарычных асаблівасцей краін сацыялізму. У разнастай-

(Працяг на 3-й стар.).

Даклад Л. І. Брэжнева друкуецца ў скарочаным варыянце.

Працяг даклада Л. І. БРЭЖНЕВА

насці форм іх грамадскага жыцця, арганізацыі эканомікі трэба бачыць тое, што ёсць у сапраўднасці: багацце шляхоў і метадаў усталявання сацыялістычнага ўкладу жыцця.

Працягваюць развівацца нашы адносіны і з сацыялістычнымі краінамі, якія не ўваходзяць у Варшаўскі Дагавор і СЭУ.

Ідзе наперад у многіх галінах савецка-югаслаўскае супрацоўніцтва. Узгодненыя прынцыпы і дагаворанасці — добрая база для яго далейшага расшырэння. У савецка - югаслаўскай дружбы карані глыбокія, і мы не сумняваемся ў яе будучыні.

Савецкі Саюз салідарны з барацьбой Карэйскай Народна - Дэмакратычнай Рэспублікі за мірнае дэмакратычнае аб'яднанне радзімы без умяшання звонку і імкнецца паглыбляць і ўзбагачаць сувязі з ёй.

Асобна прыходзіцца гаварыць аб Кітаі. Вопыт сацыяльна - эканамічнага развіцця КНР за два апошнія дзесяткі гадоў — цяжкі ўрок, які паказвае, да чаго вядзе скажэнне прынцыпаў сацыялізму, яго сутнасці як ва ўнутранай, так і ў міжнароднай палітыцы.

Самі цяперашнія кіраўнікі Кітая называюць парадкі ў сваёй краіне перыяду так званай культурнай рэвалюцыі «самай жорсткай феадальна-фашысцкай дыктатурай». Нам няма чаго дадаць да такой ацэнкі.

Ва ўнутранай палітыцы Кітая адбываюцца цяпер змяненні. Сапраўдны сэнс іх яшчэ пакажа час. Ён пакажа, у якой меры цяперашняму кітайскаму кіраўніцтву ўдасца пераадолець маасцкую спадчыну. Але аб якіх-небудзь пераменах да лепшага ў знешняй палітыцы Пекіна, на жаль, пакуль што гаварыць не прыходзіцца. Яна па-ранейшаму нацэлена на абвастрэнне міжнароднага становішча, змыкаецца з палітыкай імперыялізму. Гэта, зразумела, не верне Кітай на здаровы шлях развіцця. Імперыялісты сябрамі сацыялізму не будуць.

За гатоўнасцю ЗША, Японіі, рада краін НАТО расшыраць ваенна - палітычныя сувязі з Кітаем крыецца просты разлік — выкарыстаць яго варожасць да Савецкага Саюза, да сацыялістычнай садружнасці ў сваіх уласных, імперыялістычных інтарэсах. Рызыкоўная гульня!

Ну а што датычыць кітайскага народа, то мы глыбока перакананы: яго сапраўдным інтарэсам адпавядала б палітыка міру, толькі палітыка міру і нармальных адносін з іншымі дзяржавамі.

Калі савецка - кітайскія адносіны застаюцца замарожанымі, то прычыны тут не ў нашай пазіцыі. Савецкі Саюз не шукаў і не шукае канфрантацыі з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Мы ідзём курсам, вызначаным XXIV і XXV з'ездамі КПСС, і хацелі б будаваць сувязі з ёй на добрасуседскай аснове. Застаюцца ў сіле нашы прапановы, накіраваныя на нармалізацыю адносін з Кітаем, як застаюцца нязменнымі нашы пачуцці павагі і дружбы к кітайскаму народу.

Таварышы! У цэлым, як бачыце, Цэнтральны Камітэт праводзіў работу велізарнага аб'ёму ў інтарэсах развіцця і паглыблення нашых адносін з сацыялістычнымі краінамі. У развіцці эканомікі, культуры, ва ўдасканаленні грамадскіх адносін, сацыялістычнай дэмакратыі — літаральна ва ўсіх галінах сусветны сацыялізм упэўнена ідзе наперад. **І мы, савецкія камуністы, ганарымся той роляй, якую адыгрываюць у гэтым партыя Леніна, радзіма Вялікага Кастрычніка.**

2. РАЗВІЦЦЁ АДНОСІН З ВЫЗВАЛІЎШЫМІСЯ КРАІНАМІ

Таварышы! Адзін з важных вынікаў міжнароднай дзейнасці партыі за справаздачны перыяд заключаецца ў прыкметным расшырэнні супрацоўніцтва з краінамі, якія вызваліліся ад каланіяльнага прыгнёту.

Краіны гэтыя вельмі розныя. Адны з іх пасля вызвалення пайшлі па рэвалюцыйна - дэмакратычнаму шляху. У другіх устанавіліся капіталістычныя адносіны. Некаторыя з іх праводзяць сапраўды незалежную палітыку, іншыя ідуць сёння ў фарватэры палітыкі імперыялізму.

Пачну з дзяржаў сацыялістычнай арыентацыі, краін, якія выбралі шлях сацыялістычнага развіцця. Колькасць іх узрасла. Развіццё гэтых краін па прагрэсіўнаму шляху адбываецца, вядома, не аднолькава, ідзе ў складаных умовах. Але асноўныя напрамкі **падобныя.** Гэта—паступовая ліквідацыя пазіцый імперыялістычных манаполій, мясцовай, буйной буржуазіі і феадалаў, абмежаванне дзейнасці замежнага капіталу. Гэта — забеспячэнне народнай дзяржаве камандных вышынь у эканоміцы і пераход да планавага развіцця прадукцыйных сіл, заахвочванне кааператыўнага руху ў вёсцы. Гэта — павышэнне ролі працоўных мас у грамадскім жыцці, паступовае ўмацаванне дзяржаўнага апарату нацыянальнымі кадрамі, адданымі народу. Гэта — антыімперыялістычны характар знешняй палітыкі гэтых краін. У іх умацоўваюцца рэвалюцыйныя партыі, якія выражаюць інтарэсы шырокіх мас працоўных.

Савецкі Саюз заключыў у справаздачны перыяд дагаворы аб дружбе і супрацоўніцтве з Анголай, Эфіопіяй, Мазамбікам, Афганістанам і Народнай Дэмакратычнай Рэспублікай Йемен. Нядаўна быў падпісан дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве з Сірыяй. Упэўнен, што ён добра паслужыць далейшаму развіццю савецка - сірыйскай дружбы і справе дасягнення справядлівага міру на Блізкім Усходзе.

З вызваліўшымися дзяржавамі мы развіваем шырокае эканамічнае і навукова - тэхнічнае супрацоўніцва, выгаднае для абодвух бакоў. Вялікае месца ў нашых адносінах займае будаўніцтва ў гэтых дзяржавах буйных гаспадарчых аб'ектаў пры той або іншай форме ўдзелу СССР.

Наша краіна, па меры сваіх магчымасцей, аказвае многім набыўшым свабоду краінам садзейнічанне і ў падрыхтоўцы кадраў — інжынераў, тэхнікаў, кваліфікаваных рабочых, урачоў, настаўнікаў.

Дапамагаем мы разам з іншымі брацкімі краінамі і ўмацаванню абароназдольнасці дзяржаў, якія вызваліліся. калі яны звяртаюцца з такімі просьбамі. Гэта мела месца, напрыклад, у Анголе і Эфіопіі. З народнымі рэвалюцыямі ў гэтых краінах спрабавалі расправіцца з дапамогай заахвочвання ўнутранай контррэвалюцыі або агрэсіі звонку. Мы супраць экспарту рэвалюцыі, але не можам згадзіцца і з экспартам контррэвалюцыі.

Імперыялізм развязаў сапраўдную неаб'яўленую вайну супраць афганскай рэвалюцыі. Гэта стварыла прамую пагрозу і бяспецы нашай паўднёвай граніцы. Такое становішча прымусіла нас аказаць ваенную дапамогу, аб якой прасіла дружалюбная краіна.

Планы ворагаў Афганістана праваліліся. Прадуманая, адпавядаючая нацыянальным інтарэсам палітыка Народна-дэмакратычнай партыі і ўрада Афганістана на чале з таварышам Бабракам Кармалем умацавала народную ўладу.

Што датычыць савецкага воінскага кантынгента, то мы будзем гатовы яго вывесці па ўзгадненню з афганскім урадам. Для гэтага павінна быць поўнасцю спынена засылка ў Афганістан контррэвалюцыйных банд. Гэта павінна быць замацавана дагаворанасцямі паміж Афганістанам і яго суседзямі. Патрэбны надзейныя гарантыі, што новай інтэрвенцыі не будзе. Такая прынцыповая пазіцыя Савецкага Саюза, і мы будзем прытрымлівацца яе цвёрда!

Асобы характар мае рэвалюцыя ў Іране, якая стала буйной падзеяй у міжнародным жыцці апошніх гадоў. Пры ўсёй сваёй складанасці і супярэчлівасці гэта ў сваёй аснове антыімперыялістычная рэвалюцыя, хоць унутраная і знешняя рэакцыя імкнецца змяніць гэты яе характар.

Іранскі народ шукае свой шлях да свабоды і працвітання. Мы шчыра жадаем яму поспеху ў гэтым і гатовы развіваць з Іранам добрыя адносіны на асновах раўнапраўя і, вядома, узаемнасці.

У некаторых краінах Усходу за апошні час актыўна выстаўляюцца ісламскія лозунгі. Мы, камуністы, з павагай адносімся да рэлігійных перакананняў людзей, якія вызнаюць іслам, як і іншыя рэлігіі. Галоўнае ў тым, якія мэты ставяць сілы, што абвяшчаюць тыя або іншыя лозунгі. Пад сцягам ісламу можа разгортвацца вызваленчая барацьба. Аб гэтым сведчыць вопыт гісторыі, у тым ліку і самы нядаўні. Але ён жа гаворыць, што ісламскімі лозунгамі аперыруе і рэакцыя, якая ўзнімае контррэвалюцыйныя мяцяжы. Уся справа, значыць, у тым, які рэальны змест таго ці іншага руху.

Таварышы! Вялікае месца ва ўзаемадносінах Савецкага Саюза з набыўшымі свабоду краінамі займае, вядома, наша супрацоўніцтва з Індыяй. Мы вітаем узрастанне ролі гэтай дзяржавы ў міжнародных справах. Нашы сувязі з ёй працягваюць умацоўвацца. Савецка-індыйская дружба стала ў абедзвюх нашых краінах трывалай народнай традыцыяй.

У выніку нядаўніх перагавораў у Дэлі з прэм'ер - міністрам Індзірай Гандзі і іншымі індыйскімі дзеячамі ўвесь комплекс савецка - індыйскіх адносін істотна рушыў наперад.

Узаемадзеянне з міралюбівай незалежнай Індыяй застанецца і ў будучым адным з важных напрамкаў савецкай знешняй палітыкі.

Мы не бачым перашкод да наладжвання добрага супрацоўніцтва з Інданезіяй, ды і з іншымі краінамі — членамі АСЕАН.

За мінулае пяцігоддзе ў Афрыцы, Карыбскім басейне і Акіяніі атрымалі незалежнасць дзесяць новых дзяржаў, якія былі адразу ж прызнаны Савецкім Саюзам. Нараджэнне Рэспублікі Зімбабве, растучы напал вызваленчай барацьбы ў Намібіі, а цяпер ужо і ў ПАР наглядна паказваюць, што панаванне «класічных» каланізатараў і расістаў набліжаецца к канцу.

Імперыялістаў не задавальняе ўмацаванне незалежнасці набыўшых свабоду краін. Тысячамі шляхоў і спосабаў яны спрабуюць прывязаць да сябе гэтыя краіны, каб больш свабодна распараджацца іх прыроднымі багаццямі, выкарыстоўваць іх тэрыторыі ў сваіх стратэгічных задумах. Пры гэтым шырока выкарыстоўваецца даўні метад каланізатараў «падзяляй і пануй!».

Іменна з такіх пазіцый падыходзіць Захад і да ірана-іракскай вайны, якая ўжо ідзе пяць месяцаў, вайны абсалютна бяссэнсавай з пункту гледжання інтарэсаў гэтых дзяржаў. Але вельмі выгаднай імперыялізму, які спіць і бачыць, як бы аднавіць свае пазіцыі ў гэтым раёне. Хацелася б спадзявацца, што і ў Іраку, і ў Іране зробяць з гэтага належныя вывады.

Савецкі Саюз рашуча выступае за хутчэйшае спыненне гэтай братазабойчай вайны, за палітычнае ўрэгуляванне канфлікту. Мы імкнёмся і на практыцы садзейнічаць гэтаму.

Цяпер аб блізкаўсходняй праблеме. Дабіваючыся пануючага становішча на Блізкім Усходзе, ЗША сталі на шлях палітыкі Кэмп-Дэвіда, на шлях расколу арабскага свету і арганізацыі сепаратнай змовы паміж Ізраілем і Егіптам. Амерыканскай дыпламатыі не ўдалося ператварыць гэту сепаратную антыарабскую змову ў больш шырокае пагадненне капітулянцкага тыпу. Але яна мела поспех у іншым: адбылося новае абвастрэнне становішча ў рэгіёне.

Як жа быць далей? Нам здаецца, што пара зрушыць справу з мёртвага пункту. Пара вярнуцца да сумленных калектыўных пошукаў усеабдымнага ўрэгулявання на справядлівай і рэалістычнай аснове. У існуючых умовах гэта можна было б зрабіць, скажам, у рамках спецыяльна скліканай міжнароднай канферэнцыі.

Савецкі Саюз гатовы ў канструктыўным духу, з пазіцый добрай волі прыняць удзел у такой рабоце. Мы гатовы рабіць гэта сумесна з іншымі зацікаўленымі бакамі — з арабамі (уключаючы, вядома, Арганізацыю вызвалення Палесціны), з Ізраілем. Мы гатовы да такіх пошукаў сумесна з ЗША — у нас, напомню, быў пэўны вопыт у гэтых адносінах некалькі гадоў назад. Мы гатовы супрацоўнічаць з еўрапейскімі дзяржавамі, з усімі, хто праяўляе шчырае імкненне да забеспячэння справядлівага і трывалага міру на Блізкім Усходзе.

Карысную ролю можа, відаць, працягваць адыгрываць ва ўсім гэтым пытанні і ААН.

Што датычыць сутнасці справы, то мы па-ранейшаму перакананы: для сапраўднага міру на Блізкім Усходзе павінна быць спынена ізраільская акупацыя ўсіх захопленых у 1967 годзе арабскіх тэрыторый. Павінны быць рэалізаваны неад'емныя правы арабскага народа Палесціны, аж да стварэння ўласнай дзяржавы. Неабходна забяспечыць бяспеку і суверэнітэт усіх дзяржаў гэтага рэгіёна, у тым ліку Ізраіля. Такія асноўныя прынцыпы.

Важным фактарам міжнародных адносін быў і застаецца рух недалучэння, які якраз у гэтым годзе адзначае дваццацігоддзе свайго існавання. Сіла яго— у накіраванасці супраць імперыялізму і каланіялізму, супраць вайны і агрэсіі. Мы ўпэўнены, што ключ да далейшага павышэння ролі руху недалучэння ў сусветнай палітыцы — а гэта мы віталі б— у яго вернасці гэтым сваім асноватворным прынцыпам.

У сярэдзіне 70-х гадоў былыя каланіяльныя краіны паставілі пытанне аб новым міжнародным эканамічным парадку. Перабудова міжнародных эканамічных адносін на дэмакратычнай аснове, на прынцыпах раўнапраўя гістарычна заканамерная. Тут многае можа і павінна быць зроблена. Але, вядома, нельга, як гэта часам робяць, зводзіць пытанне проста да адрозненняў паміж «багатай поўначчу» і «бедным поўднем». Мы гатовы садзейнічаць і на практыцы садзейнічаем устанаўленню справядлівых міжнародных эканамічных адносін.

Ні ў кога не павінна быць сумненняў, таварышы: **КПСС і ў далейшым будзе паслядоўна праводзіць курс на развіццё супрацоўніцтва СССР з набыўшымі свабоду краінамі, на ўмацаванне саюза сусветнага сацыялізму і нацыянальна-вызваленчага руху.**

(Працяг на 4-й стар.).

Працяг даклада Л. І. БРЭЖНЕВА

3. КПСС І СУСВЕТНЫ КАМУНІСТЫЧНЫ РУХ

К рубяжу 80-х гадоў міжнародны рабочы клас і яго палітычны авангард — камуністычныя і рабочыя партыі — падышлі упэўненым поступам. Падышлі як актыўныя барацьбіты за правы працоўных, за мір і бяспеку народаў.

Камуністычны рух працягваў расшыраць свае рады, умацоўваць свой уплыў у масах. Цяпер кампартыі актыўна дзейнічаюць у 94 краінах свету. У адной толькі Заходняй Еўропе за апошнія дзесяць гадоў у іх рады ўлілося каля 800 тысяч новых барацьбітоў.

Наша партыя, яе Цэнтральны Камітэт вялі актыўную работу, накіраваную на далейшае расшырэнне і паглыбленне ўсебаковага супрацоўніцтва з брацкімі партыямі. У справаздачны перыяд толькі члены і кандыдаты ў члены Палітбюро, сакратары Цэнтральнага Камітэта прынялі некалькі соцень партыйных дэлегацый. Прадстаўнікі КПСС, у сваю чаргу, удзельнічалі ў рабоце з'ездаў і іншых мерапрыемстваў кампартый.

Мы рэгулярна інфармавалі брацкія партыі аб падзеях нашага ўнутранага жыцця, аб нашых знешнепалітычных акцыях. Зарубежныя таварышы мелі шырокія магчымасці пазнаёміцца і з практычнай дзейнасцю КПСС на месцах — у рэспубліках, абласцях, на прадпрыемствах.

Кантакты з зарубежнымі камуністамі даюць магчымасць і нашай партыі лепш арыентавацца ў абстаноўцы ў асобных краінах.

Па меры росту ўплыву кампартый задачы, якія стаяць перад імі, становяцца ўсё больш складанымі і разнастайнымі. А гэта параджае часам неадназначныя ацэнкі, адрозненні ў падыходах да вырашэння канкрэтных пытанняў класавай барацьбы, выклікае дыскусіі і паміж партыямі.

На наш погляд, гэта зусім натуральна. Неаднолькавыя меркаванні па тых ці іншых пытаннях у кампартый бывалі і раней. Жыццё пераканаўча даказала, што і пры наяўнасці разыходжанняў можна і трэба развіваць палітычнае супрацоўніцтва ў барацьбе супраць агульнага класавага праціўніка. Вярхоўны арбітр у вырашэнні ўзнікаючых праблем — час, практыка. Меў поўную рацыю У. І. Ленін, указваючы, што многія рознагалоссі «могуць знікнуць і абавязкова знікнуць: гэты вынік будзе выкліканы логікай сумеснай барацьбы з сапраўды грозным ворагам, з буржуазіяй...».

Не так даўно кіраўніцтва некаторых кампартый выступіла з энергічнай абаронай права на нацыянальную спецыфіку шляхоў і форм барацьбы за сацыялізм і сацыялістычнага будаўніцтва. Аднак, калі падыходзіць да пытання непрадузята, то трэба прызнаць, што ніхто нікому не навязвае ніякіх шаблонаў і схем, якія ігнаравалі б асаблівасці той або іншай краіны.

Добра вядома пазіцыя У. І. Леніна ў гэтым пытанні. «Усе нацыі прыйдуць да сацыялізму, гэта непазбежна, — пісаў ён, — але ўсе прыйдуць не зусім аднолькава, кожная ўнясе своеасаблівасць у тую ці іншую форму дэмакратыі, у тую ці іншую разнавіднасць дыктатуры пралетарыяту, у той ці іншы тэмп сацыялістычных пераўтварэнняў розных бакоў грамадскага жыцця».

Наша партыя няўхільна прытрымліваецца гэтай ленінскай устаноўкі, якая сёння з усёй пераканаўчасцю пацверджана гістарычнай практыкай. Удумайцеся, таварышы. Ні ў адной жа з цяпер існуючых сацыялістычных краін формы, метады, шляхі сацыялістычнай рэвалюцыі не былі механічным паўтарэннем чужога вопыту. ГДР або Польшча, Венгрыя або Куба, Манголія або Югаславія—словам, усе сацыялістычныя краіны ажыццявілі рэвалюцыі па-свойму, у формах, якія дыктаваліся суадносінамі класавых сіл унутры кожнай з гэтых краін, нацыянальным укладам і знешняй абстаноўкай.

Стварэнне і ўмацаванне асноў сацыялізму, будаўніцтва сацыялістычнага грамадства, як я ўжо гаварыў, таксама мелі і маюць у розных краінах свае асаблівасці.

Так што гаварыць аб нейкай «уніфікацыі», проціпастаўляць кампартыі па прыкмеце прызнання або непрызнання выбіраемых імі шляхоў перабудовы грамадства можна, мне думаецца, толькі ігнаруючы рэальныя факты.

У некаторых кампартыях выказваюцца часам крытычныя меркаванні наконт тых ці іншых канкрэтных бакоў развіцця нашай краіны. Мы зусім не лічым, што ўсё ў нас было ідэальна. Сацыялізм у СССР будаваўся ў неймаверна складаных умовах. Партыя пракладвала шлях па цаліне. І ніхто лепш за нас не ведае, якія цяжкасці і недахопы сустракаліся на гэтым шляху, якія засталіся яшчэ непераадолеными.

Да таварыскай, канструктыўнай крытыкі мы ўважліва прыслухоўваемся. Але мы рашуча супраць такой «крытыкі», якая скажае сацыялістычную рэчаіснасць і тым самым вольна або нявольна аказвае паслугу імперыялістычнай прапагандзе, класаваму праціўніку.

Наша партыя зыходзіць з таго, што разыходжанні ў меркаваннях паміж камуністамі пераадольныя — калі, вядома, гэта не прынцыповыя разыходжанні паміж рэвалюцыянерамі і рэфармістамі, паміж тзорчым марксізмам і дагматычным сектанцтвам, лявацкім авантурызмам. Тут, зразумела, кампрамісаў быць не можа — сёння гэтак жа, як і ў часы Леніна. Але калі камуністы змагаюцца за агульную рэвалюцыйную справу, мы зыходзім з таго, што цярплівае таварыскае абмеркаванне розных поглядаў і пазіцый найлепшым чынам адпавядае іх агульным мэтам.

Вялікай аб'ядноўваючай асновай, магутным фактарам далейшага згуртавання і росту аўтарытэту сусветнага камуністычнага руху служыць паслядоўная барацьба камуністаў за мір, супраць агрэсіўнай палітыкі імперыялізму, гонкі ўзбраенняў, якая нясе народам пагрозу ядзернай катастрофы.

Галоўнае заключаецца ў тым, што камуністы, узброеныя вучэннем марксізму-ленінізму, глыбей за ўсіх і правільней за ўсіх бачаць сутнасць і перспектыву адбываючыхся ў свеце працэсаў, робяць з гэтага правільныя вывады для сваёй барацьбы за інтарэсы рабочага класа, працоўных сваіх краін, за дэмакратыю, мір і сацыялізм.

На гэтай аснове КПСС будуе свае адносіны з брацкімі партыямі. У нас добрыя адносіны з велізарнай большасцю камуністычных партый — з Французскай, Партугальскай, Германскай, Грэчаскай, Фінскай, Дацкай, Аўстрыйскай і іншымі кампартыямі Еўропы. Такія ж добрыя адносіны ў КПСС з брацкімі партыямі краін Амерыкі, Азіі, Афрыкі, Аўстраліі. Мы будзем і ў далейшым умацоўваць гэтыя адносіны ў імя нашай агульнай справы — справы міру і сацыялізму.

Буйной падзеяй у жыцці міжнароднага камуністычнага руху з'явілася Берлінская канферэнцыя камуністычных і рабочых партый Еўропы ў 1976 годзе. Яна вызначыла надзейныя арыенціры для рабочага класа, шырокіх працоўных мас у барацьбе супраць гонкі ўзбраенняў, за ўмацаванне разрадкі, за сацыяльны прагрэс.

Новы стымул барацьбе супраць ваеннай небяспекі дала Парыжская сустрэча камуністычных і рабочых партый Еўропы ў 1980 годзе. Яна садзейнічала актывізацыі барацьбы народных мас кантынента супраць сур'ёзнай небяспекі, якая навісла над Еўропай у сувязі з рашэннем блока НАТО аб размяшчэнні ў Заходняй Еўропе новых амерыканскіх ракет з ядзернымі зарадамі.

За справаздачны перыяд умацавалася супрацоўніцтва КПСС з іншымі дэмакратычнымі сіламі. Атрымалі, у прыватнасці, далейшае развіццё нашы сувязі з сацыялістычнымі і сацыял-дэмакратычнымі партыямі Фінляндыі, Бельгіі, Швецыі, Японіі, Іспаніі і рада іншых краін — галоўным чынам па пытаннях барацьбы з ваеннай небяспекай. Важнае значэнне мелі кантакты з кіраўніцтвам Сацінтэрна,. наш удзел у канферэнцыі Сацінтэрна па раззбраенню, кантакты са створанай ім па гэтай праблеме рабочай групай, прыём яе дэлегацыі ў ЦК КПСС.

Сучасная сацыял-дэмакратыя мае значную палітычную вагу. Яна магла б больш рабіць для абароны жыццёвых інтарэсаў народаў і перш за ўсё — для ўмацавання міру, аздараўлення міжнароднай абстаноўкі, для адпору фашызму і расізму, наступленню рэакцыі на палітычныя правы працоўных. На практыцы, аднак, лідэры сацыял-дэмакратыі далёка не заўсёды дзейнічаюць у гэтым напрамку.

Многія з іх заражаны вірусам антыкамунізму. Некаторыя даюць уцягнуць сябе ў арганізуемыя імперыялізмам кампаніі супраць сацыялістычных краін і, спасылаючыся на так званую атлантычную салідарнасць, апраўдваюць гонку ўзбраенняў. Зразумела, што такая палітыка не адпавядае інтарэсам працоўных. Мы яе рашуча асуджаем.

Але мы будзем актыўна падтрымліваць усе крокі, карысныя для справы міру і дэмакратыі. Ва ўмовах цяперашняга ўскладнення міжнароднай абстаноўкі супрацоўніцтва з сацыял-дэмакратамі, з прафсаюзамі, з рэлігійнымі коламі, з усімі дэмакратычнымі, міралюбівымі сіламі ў пытаннях прадухілення вайны і ўмацавання міру ўяўляецца нам важным. Добрым прыкладам такога супрацоўніцтва стаў Сусветны парламент народаў за мір, які адбыўся ў мінулым годзе ў Сафіі.

Савецкія камуністы вітаюць дасягненні кампартый у расшырэнні сваіх радоў, умацаванні сувязей з масамі, у адстойванні інтарэсаў рабочага класа і ўсіх працоўных, іх дэмакратычных правоў і свабод, у барацьбе за абмежаванне ўсяўладдзя манаполій, спыненне росту мілітарызму, за сацыялістычную перспектыву развіцця сваіх краін.

Мы выказваем гарачую салідарнасць з нашымі братамі-камуністамі, якія пакутуюць у засценках фашысцкіх дыктатур, падвяргаюцца паліцэйскім рэпрэсіям, вядуць цяжкую барацьбу ў падполлі. Салідарнасць з тымі, каго дыскрымінуюць, пазбаўляюць грамадзянскіх і палітычных правоў толькі за іх перакананні, за прыналежнасць да партыі рабочага класа.

Гонар і слава камуністам — мужным барацьбітам за народную справу!

4. АДНОСІНЫ З КАПІТАЛІСТЫЧНЫМІ ДЗЯРЖАВАМІ. ПРОЦІДЗЕЯННЕ СІЛАМ АГРЭСІІ. ПАЛІТЫКА МІРУ І СУПРАЦОЎНІЦТВА

Таварышы! У справаздачны перыяд СССР працягваў актыўна праводзіць ленінскую палітыку мірнага суіснавання і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з капіталістычнымі дзяржавамі, цвёрдага адпору агрэсіўным падкопам імперыялізму.

У гэтыя гады адбывалася далейшае абвастрэнне агульнага крызісу капіталізму. Капіталізм, безумоўна, не застыў у сваім развіцці. Але ён перажывае ўжо трэці за апошнія дзесяць гадоў эканамічны спад.

Небывалыя маштабы набыла інфляцыя. З 1970 года ў развітых капіталістычных краінах цэны падняліся ў сярэднім у 2,3 раза, у тым ліку з 1975 года — у паўтара раза. Крывая росту інфляцыі становіцца ўсё больш крутой. Не выпадкова ж і новы прэзідэнт Злучаных Штатаў, уступаючы на пасаду, прызнаў, што ЗША церпяць ад «аднаго з самых горшых перыядаў інфляцыі за нацыянальную гісторыю», што «інфляцыя пагражае пахіснуць самыя асновы жыцця» мільёнаў амерыканцаў.

Цяжкасці, якія зведвае капіталізм, робяць уплыў і на яго палітыку, у тым ліку на палітыку знешнюю. Абвастрылася барацьба вакол асноўных пытанняў знешнепалітычнага курсу капіталістычных краін. У апошні час прыкметна актывізаваліся праціўнікі разрадкі, абмежавання ўзбраенняў, паляпшэння адносін з Савецкім Саюзам і іншымі краінамі сацыялізму.

Авантурызм, гатоўнасць ставіць на карту жыццёвыя інтарэсы чалавецтва ў імя сваіх вузкіх карыслівых мэт — вось што асабліва непрыкрыта праяўляецца ў палітыцы найбольш агрэсіўных колаў імперыялізму. Дэманструючы поўную пагарду да правоў і спадзяванняў народаў, яны спрабуюць паказаць вызваленчую барацьбу народных мас як праяўленне «тэрарызму». Яны сапраўды задаліся мэтай дасягнуць недасягальнага — паставіць бар'ер на шляху прагрэсіўных змяненняў у свеце, вярнуць сабе ролю вяршыцеляў лёсу народаў.

Беспрэцэдэнтна растуць ваенныя расходы. У ЗША яны дасягнулі ста пяцідзесяці мільярдаў долараў у год. Але і такія астранамічныя лічбы не задавальняюць амерыканскі ваенна-прамысловы комплекс, ён патрабуе большага. Аўтаматычна нарошчваць ваенныя асігнаванні ледзь не да канца цяперашняга стагоддзя абавязаліся, падпарадкоўваючыся патрабаванням Вашынгтона, і саюзнікі ЗША па НАТО, хоць некаторыя — вельмі неахвотна.

Значная частка гэтых велізарных сродкаў ідзе на паскоранае развіццё новых відаў стратэгічнай ядзернай зброі. Іх стварэнне суправаджаецца выстаўленнем небяспечных для справы міру ваенных дактрын, накшталт праславутай дырэктывы Картэра. Людзей хочуць пераканаць, быццам ядзерная вайна можа быць абмежаванай, хочуць прымірыць іх з думкай аб дапушчальнасці такой вайны.

Але гэта ж прамое ашуканства народаў! Бо «абмежаваная», па амерыканскіх паняццях, ядзерная вайна, скажам, у Еўропе азначала б ужо ў самым пачатку верную гібель еўрапейскай цывілізацыі. Ды і самі Злучаныя Штаты, зразумела, не змаглі б застацца ў баку ад полымя вайны.

Імперыялістычныя колы мысляць катэгорыямі панавання і прымусу ў адносінах да іншых дзяржаў і народаў.

Манаполіям патрэбны чужая нафта, уран, каляровыя металы — і сферай «жыццёвых інтарэсаў» ЗША аб'яўляюцца Блізкі Усход, Афрыка, Індыйскі акіян. Туды актыўна прарываецца ваенная машына ЗША і збіраецца размясціцца надоўга. Востраў Дыега-Гарсія ў Індыйскім акіяне, Аман, Кенія, Самалі, Егіпет — што далей?

Каб падзяліць з іншымі расходы, а заадно мацней прывязаць да сябе партнёраў па НАТО, ЗША дабіваюцца расшырэння функцый гэтага блока. Вашынгтонскім стратэгам яўна хацелася б уцягнуць у свае ваенныя падрыхтаванні дзесяткі іншых дзяржаў, аблытаць свет павуцінай сваіх баз, аэрадромаў, складаў зброі.

У апраўданне такіх дзеянняў распаўсюджваюць версію аб «савецкай пагрозе» нафтавым багаццям Блізкага і Сярэдняга Усходу або шляхам транспарціроўкі нафты. Заведама лжывую версію, бо яе аўтары добра ведаюць, што СССР не збіраецца рабіць замаху ні на тое, ні на другое. І наогул недарэчна думаць, што можна «абараняць» нафтавыя інтарэсы Захаду, ператвараючы гэты раён у парахавы склеп.

Не, у нас зусім іншыя погляды на тое, як сапраўды можа быць забяспечаны мір у раёне Персідскага заліва і на подступах да яго. Замест сцягвання туды ўсё новых і новых марскіх і паветраных армад, войск і ўзбраенняў мы прапануем зняць тут ваенную пагрозу, заключыўшы міжнароднае пагадненне. Сумеснымі намаганнямі, з улікам законных інтарэсаў усіх бакоў, можна стварыць у гэтым раёне абстаноўку стабільнасці і спакою. Можна гарантаваць суверэнныя правы дзяржаў рэгіёна і бяспеку марскіх і іншых камунікацый, якія звязваюць яго з астатнім светам. Такі сэнс прапаноў, унесеных нядаўна Савецкім Саюзам.

Гэта ініцыятыва сустрэла шырокую падтрымку ў свеце, у тым ліку з боку рада дзяржаў Персідскага заліва. Аднак, знайшліся і праціўнікі савецкай прапановы — няцяжка здагадацца, у чыім стане. Мы хацелі б выказаць надзею, што ўрады ЗША і іншых краін НАТО спакойна і непрадузята абдумаюць усё гэта пытанне з тым, каб можна было разам пашукаць прымальнае для ўсіх рашэнне.

Дасягненне дагаворанасці па гэтаму пытанню магло б да таго ж пакласці пачатак вельмі важнаму працэсу зніжэння ваеннай прысутнасці ў розных раёнах Сусветнага акіяна.

У адносінах з ЗША мы ўсе гэтыя гады, як і раней, праводзілі прынцыповую і канструктыўную лінію. На жаль, ранейшая адміністрацыя ў Вашынгтоне рабіла стаўку зусім не на развіццё адносін, не на ўзаемаразуменне. Спрабуючы аказаць на нас націск, там прыняліся разбураць тое станоўчае, што з немалой цяжкасцю ўдалося стварыць у савецка-амерыканскіх адносінах за папярэднія гады. У выніку нашы двухбаковыя сувязі па раду напрамкаў аказаліся адкінутымі назад. Было замарожана ўступленне ў сілу Дагавора АСУ-2. Па некаторых жа пытаннях абмежавання ўзбраенняў, такіх, як скарачэнне паставак зброі трэцім краінам, ЗША ў аднабаковым парадку спынілі перагаворы з намі.

На жаль, і пасля змены кіраўніцтва ў Белым доме з Вашынгтона чуваць яўна ваяўнічыя заклікі і заявы, як бы спецыяльна разлічаныя на тое, каб атруціць атмасферу адносін паміж нашымі краінамі. Хацелася б усё ж спадзявацца, што тыя, хто вызначае палітыку Амерыкі сёння, здолеюць у канчатковым выніку глянуць на рэчы больш рэальна. Існуючая ваенна-стратэгічная раўнавага паміж СССР і ЗША, паміж Варшаўскім Дагаворам і НАТО аб'ектыўна служыць захаванню міру на нашай планеце. Мы не дабіваліся і не дабіваемся ваеннай перавагі над другім бокам. Гэта не наша палітыка. Але мы і не дазволім стварыць такую перавагу над намі. Такія спробы, а таксама размовы з намі з пазіцыі сілы абсалютна бесперспектыўныя!

Не спрабаваць зламаць існуючую раўнавагу, не навязваць новы, яшчэ больш дарагі і небяспечны тур гонкі ўзбраенняў — вось што было б праяўленнем

(Працяг на 5-й стар.).

Працяг даклада Л. І. БРЭЖНЕВА

сапраўднай дзяржаўнай мудрасці. А для гэтага, сапраўды ж, даўно пара выставіць за дзверы сур'ёзнай палітыкі сатарэлае пудзіла «савецкай пагрозы».

Давайце паглядзім на сапраўднае становішча спраў.

Ці ідзе размова аб стратэгічных ядзерных узбраеннях або аб ядзернай зброі сярэдняй дальнасці ў Еўропе, у абодвух выпадках паміж бакамі існуе прыкладная роўнасць. Па адных відах зброі некаторая перавага ў Захаду, па другіх — у нас. І роўнасць можа быць больш трывалай, калі будуць заключаны адпаведныя дагаворы і пагадненні.

Гавораць далей аб танках. Іх у Савецкага Саюза сапраўды больш. Аднак у краінах НАТО іх таксама нямала. Акрамя таго, у іх значна больш процітанкавых сродкаў.

Не адпавядае рэчаіснасці і версія адносна савецкай перавагі ў агульнай колькасці ўзброеных сіл. У ЗША разам з іншымі краінамі НАТО яна нават некалькі большая, чым у СССР і іншых краін Варшаўскага Дагавора.

Аб якой жа савецкай ваеннай перавазе можа ісці размова?

Ваенная пагроза над ЗША, як і над усімі іншымі краінамі свету, сапраўды навісла. Але яе крыніца — не Савецкі Саюз, не яго міфічная перавага, а сама гонка ўзбраенняў, існуючая ў свеце напружанасць. З гэтай сапраўднай, а не ўяўнай пагрозай мы гатовы змагацца — поплеч з Амерыкай, з еўрапейскімі дзяржавамі, з усімі краінамі нашай планеты. Спрабаваць перамагчы адзін аднаго ў гонцы ўзбраенняў, разлічваць на перамогу ў ядзернай вайне — гэта небяспечнае вар'яцтва.

Агульнапрызнана, што міжнародная абстаноўка ў многім залежыць ад палітыкі СССР і ЗША. Стан адносін паміж імі цяпер і вастрыня міжнародных праблем, патрабуючых вырашэння, на нашу думку, дыктуюць неабходнасць дыялога на ўсіх узроўнях, і прытым актыўнага. Мы к дыялогу гатовы.

Вопыт паказвае, што рашаючае звяно тут — сустрэчы на самым высокім узроўні. Гэта было правільным учора і застаецца правільным сёння.

СССР хоча нармальных адносін з ЗША. З пункту гледжання інтарэсаў як народаў абедзвюх нашых краін, так і чалавецтва ў цэлым, іншага разумнага шляху проста не дадзена.

Таварышы! Мінулае пяцігоддзе — гады мэтанакіраванай барацьбы партыі і Савецкай дзяржавы за мір і бяспеку ў Еўропе.

На еўрапейскім кантыненце, насуперак намаганням ворагаў разрадкі, мірнае супрацоўніцтва паміж краінамі дзвюх сістэм развіваецца ўвогуле нядрэнна. Шырэйшымі і больш насычанымі сталі палітычныя кантакты. Па раду буйных праблем знешняй палітыкі нам нярэдка ўдаецца знаходзіць агульную мову. Растуць, набываючы новыя якасці, гаспадарчыя, навукова-тэхнічныя і культурныя сувязі. Праведзены шматбаковыя нарады па розных пытаннях агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва.

Шырокая сістэма сувязей склалася ў нас з Францыяй. Падтрымліваецца практычна няспынны палітычны дыялог на розных узроўнях, перш за ўсё з прэзідэнтам В. Жыскар д'Эстэнам. У тры разы павялічыўся аб'ём савецка-французскага гандлю. Больш як 300 тэм і напрамкаў ахоплівае ўзаемадзеянне ў сферы навукі, тэхнікі і культуры. І хоць не з усімі дзеяннямі Францыі на міжнароднай арэне мы згодны, нашы адносіны застаюцца буйным фактарам разрадкі.

На базе дагавора 1970 года і наступных пагадненняў у цэлым спрыяльна складваліся нашы адносіны з Федэратыўнай Рэспублікай Германіі. Сустрэчы з канцлерам Г. Шмітам у 1978 і 1980 гадах, як і раней з В. Брантам, унеслі карысны ўклад у справу разрадкі на еўрапейскім кантыненце, расшырылі гарызонты ўзаемавыгадных савецка-заходнегерманскіх сувязей. За пяцігоддзе амаль падвоіўся наш гандаль з ФРГ. Прыкметнае месца ў эканамічных сувязях займаюць буйныя праекты, такія, як пастаўкі абсталявання для «Атаммаша», Аскольскага электраметалургічнага камбіната труб і абсталявання і г. д.

Але ёсць сферы — і немалаважныя,— дзе пазіцыі СССР і ФРГ істотна разыходзяцца. Дастаткова сказаць аб спробах Бона абыходзіць часам чатырохбаковае пагадненне па Заходняму Берліну, не лічыцца ў радзе пытанняў з суверэнітэтам ГДР. Мы за строгае і поўнае захаванне дасягнутых у 70-я гады дагаворанасцей.

Ёсць пэўны прагрэс і ў нашых адносінах з Італіяй. Маюць месца палітычныя кантакты, шырацца эканамічнае супрацоўніцтва, узаемнае азнаямленне з багаццямі культуры нашых народаў.

На трывалай аснове дружбы і добрасуседства развіваюцца савецка-фінляндскія адносіны. Мы аддаём належнае ўкладу Фінляндыі і асабіста прэзідэнта Кеканена ў справу ўмацавання еўрапейскай бяспекі. Задаволены мы і тым, што нядрэнна растуць нашы эканамічныя сувязі, паспяхова ідзе сумесна будаўніцтва буйных прамысловых аб'ектаў.

Мы гатовы развіваць далей добрыя адносіны з нашым суседам Турцыяй, традыцыйныя сувязі з Грэцыяй, вітаем паспяховае развіццё адносін з Аўстрыяй, Швецыяй, Бельгіяй, Кіпрам і радам іншых еўрапейскіх краін. Пасля саракагадовага перапынку пайшлі ў нармальным напрамку адносіны з Іспаніяй.

Што датычыць савецка-англійскіх адносін, то тут, на жаль, застой — і не па нашай віне. Думаю, што гэта не адпавядае інтарэсам ні СССР, ні Англіі.

Гаворачы аб еўрапейскіх справах, нельга абысці маўчаннем і той факт, што з'явіліся новыя сур'ёзныя небяспекі для міру ў Еўропе. Гутарка ідзе перш за ўсё аб рашэнні НАТО размясціць у Заходняй Еўропе новыя амерыканскія ракетна-ядзерныя сродкі. Гэта рашэнне —не «адказ» на ўяўны савецкі выклік, не звычайная «мадэрнізацыя» арсенала, як сцвярджаюць на Захадзе. У наяўнасці відавочны намер змяніць на карысць НАТО існуючы ваенны баланс у Еўропе.

Павінна быць ясна: размяшчэнне нацэленых супраць СССР і яго саюзнікаў новых амерыканскіх ракет на зямлі ФРГ, Італіі, Англіі, Галандыі або Бельгіі не можа не адбіцца на нашых адносінах з гэтымі краінамі, не гаворачы ўжо аб уроне, які будзе нанесены іх уласнай бяспецы.

Кроўныя інтарэсы еўрапейскіх народаў патрабуюць, каб Еўропа ішла іншым шляхам — тым, які пракладзены ў Хельсінкі.

Мы лічым, што працэс, пачаты агульнаеўрапейскай нарадай, павінен быць бесперапынным. Любыя формы перагавораў — шматбаковыя, двухбаковыя— трэба выкарыстоўваць для вырашэння праблем, якія хвалююць Еўропу.

Аб адносінах з Японіяй. У яе знешнепалітычным курсе ўзмацняюцца негатыўныя моманты — падыгрыванне небяспечным планам Вашынгтона і Пекіна, тэндэнцыя да мілітарызацыі. Мы, аднак, не лічым, што гэта, так сказаць, апошняе слова Токіо, і спадзяёмся, што там перамогуць дальнабачнасць, разуменне ўласных інтарэсаў. СССР па-ранейшаму за трывалыя, пасапраўднаму добрасуседскія адносіны з Японіяй.

Значна павысілася роля на сусветнай арэне дзяржаў Лацінскай Амерыкі, у тым ліку такіх, як Мексіка, Бразілія, Аргенціна, Венесуэла, Перу. Мы з задавальненнем адзначаем расшырэнне ўзаемакарысных сувязей СССР з лацінаамерыканскімі краінамі, гатовы развіваць гэтыя сувязі і далей.

Немалыя рэзервы ёсць і для развіцця адносін з Канадай. І дзверы для далейшага расшырэння супрацоўніцтва з ёю, як і з іншымі капіталістычнымі дзяржавамі, будуць і ў далейшым адчынены. Супрацоўніцтва самага шырокага— з урадамі, парламентамі, дзелавымі коламі, дзеячамі культуры, грамадскімі арганізацыямі.

Такім чынам, таварышы, намечаная яшчэ У. І. Леніным палітыка мірнага суіснавання робіць усё больш вызначальны ўплыў на сучасныя міжнародныя адносіны. Сямідзесятыя гады паказалі гэта з усёй пераканаўчасцю.

Жыццё патрабуе плённага супрацоўніцтва ўсіх дзяржаў у імя вырашэння мірных, канструктыўных задач, якія стаяць перад кожным народам і ўсім чалавецтвам.

А яно, гэта супрацоўніцтва, — не беспадстаўная ўтопія. Пачаткі яго — няхай пакуль што яшчэ скромныя—ёсць і цяпер, у нашы дні.

Карыснае супрацоўніцтва развіваецца цяпер, у тым ліку у рамках міжнародных арганізацый, паміж значнай колькасцю дзяржаў у такіх галінах, як мірнае выкарыстанне атамнай энергіі, барацьба з эпідэмічнымі хваробамі, ліквідацыя непісьменнасці, ахова гістарычных і культурных помнікаў, служба прагнозаў надвор'я. Ва ўсім гэтым актыўна ўдзельнічае наша краіна.

Словам, ужо ёсць апраўдаўшая сябе аснова для далейшага асваення нівы практычнага мірнага супрацоўніцтва дзяржаў. А неабходнасць у гэтым усё больш відавочная.

5. УМАЦАВАЦЬ МІР, ПАГЛЫБІЦЬ РАЗРАДКУ, СПЫНІЦЬ ГОНКУ ЎЗБРАЕННЯЎ

Таварышы! Асноўным напрамкам знешнепалітычнай дзейнасці партыі і дзяржавы была і застаецца барацьба за аслабленне пагрозы вайны, спыненне гонкі ўзбраенняў. Цяпер гэта задача набыла асаблівае значэнне і тэрміновасць. Справа ў тым, што ў развіцці ваеннай тэхнікі адбываюцца хуткія і глыбокія змены. Распрацоўваюцца якасна новыя віды зброі, і ў першую чаргу зброі масавага знішчэння. Такія віды, якія могуць зрабіць кантроль над імі, а значыць і ўзгодненае абмежаванне іх — справай выключна цяжкай, а то і немагчымай. Новы этап гонкі ўзбраенняў падарве міжнародную стабільнасць, намнога ўзмоцніць небяспеку ўзнікнення вайны.

Становішча ўскладняецца тым, што палітыка агрэсіўных імперыялістычных сіл ужо прывяла да значнага росту міжнароднай напружанасці з усімі выцякаючымі адсюль небяспечнымі вынікамі.

Няма, напэўна, дзяржавы, якая за апошнія гады выступіла б перад чалавецтвам з такім шырокім спектрам канкрэтных і рэалістычных ініцыятыў па важнейшых праблемах міжнародных адносін, як гэта зрабіў Савецкі Саюз.

Пачну з праблемы абмежавання ядзерных узбраенняў, самых небяспечных для чалавецтва. Усе гэтыя гады Савецкі Саюз рашуча змагаўся за тое, каб пакласці канец гонцы такіх узбраенняў, выключыць далейшае іх распаўсюджванне на планеце. Была, як вы ведаеце, праведзена велізарная работа па падрыхтоўцы дагавора з ЗША аб абмежаванні стратэгічных узбраенняў. Многае было зроблена ў ходзе перагавораў з ЗША і Англіяй аб поўнай забароне выпрабаванняў ядзернай зброі. Мы выступілі з важнай акцыяй, заявіўшы і пацвердзіўшы, што не будзем прымяняць ядзерную зброю супраць няядзерных краін, якія не дапускаюць яе размяшчэння на сваёй тэрыторыі. Але мы прапанавалі і большае: спыніць вытворчасць ядзернай зброі, пачаць скарачэнне яе запасаў, аж да поўнай ліквідацыі.

Савецкі Саюз актыўна дабіваўся забароны і ўсіх іншых відаў зброі масавага знішчэння. Сяго-таго ў гэтым напрамку за справаздачны перыяд удалося дасягнуць. Уступіла ў сілу канвенцыя аб забароне ўздзеяння на прыроднае асяроддзе ў ваенных мэтах. Папярэдне ўзгоднены асноўныя палажэнні дагавора, які забараняе радыялагічную зброю. Працягваюцца, хоць і недапушчальна марудна, перагаворы аб выключэнні з арсеналаў дзяржаў хімічнай зброі. Дзеяннямі міралюбівых сіл удалося прыпыніць рэалізацыю планаў разгортвання ў Заходняй Еўропе нейтроннай зброі. Тым большае абурэнне народаў выклікаюць зноў распачынаемыя Пентагонам спробы навесіць дамоклаў меч гэтай зброі над краінамі Еўропы. Мы са свайго боку пацвярджаем, што не пачнём яе вытворчасць, калі яна не з'явіцца ў іншых дзяржаў, і гатовы заключыць пагадненне, якое раз і назаўсёды забараніла б гэту зброю.

Савецкі Саюз і іншыя краіны Варшаўскага Дагавора выступілі з шэрагам канкрэтных прапаноў па ваеннай разрадцы ў Еўропе. Мы хацелі б, у прыватнасці, каб удзельнікі агульнаеўрапейскай нарады абавязаліся не прымяняць першымі адзін супраць аднаго ні ядзерных, ні звычайных узбраенняў; каб не расшыраліся існуючыя і не ствараліся новыя ваенныя блокі ў Еўропе і на іншых кантынентах.

Для абмеркавання і вырашэння пытанняў ваеннай разрадкі і разбраення ў Еўропе Савецкі Саюз і яго саюзнікі прапанавалі склікаць агульнаеўрапейскую канферэнцыю. Гэта пытанне знаходзіцца ў цэнтры ўвагі праходзячай цяпер сустрэчы ў Мадрыдзе.

Не аслаблялі мы намаганняў і для дасягнення прагрэсу на венскіх перагаворах аб скарачэнні ўзброеных сіл і ўзбраенняў у Цэнтральнай Еўропе. Сацыялістычныя краіны прайшлі тут больш, чым паўдарогі, насустрач заходнім партнёрам. Але трэба прама сказаць, калі заходнія краіны будуць і далей зацягваць гэтыя перагаворы, адначасова нарошчваючы свой ваенны патэнцыял у Еўропе, то нам прыйдзецца прыняць пад увагу гэты факт.

Многія важныя ініцыятывы, з якімі Савецкі Саюз і яго саюзнікі выступілі на працягу мінулага пяцігоддзя, былі адобраны рашэннямі ААН, у тым ліку на спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі па разбраенню.

Савецкія прапановы па ўмацаванню міжнароднай бяспекі і абмежаванню гонкі ўзбраенняў захоўваюць сваю сілу. Над іх ажыццяўленнем працягваюць актыўна працаваць пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта партыі савецкія дыпламаты, усе работнікі знешнепалітычнага фронту.

Нашы дзеянні сугучныя імкненням іншых краін і народаў. Дастаткова ўспомніць, што многімі дзяржавамі з розных кантынентаў унесены і атрымалі шырокую міжнародную падтрымку, прапановы — аб'явіць побач з Лацінскай Амерыкай бяз'ядзернымі зонамі Афрыку і Блізкі Усход, стварыць зоны міру ў Паўднёва-Усходняй Азіі, у Індыйскім акіяне, у Міжземным моры. А рашэнні агульнаеўрапейскай нарады фактычна нацэлены на тое, каб такой зонай стала і ўся Еўропа.

Таварышы! Мы працягваем барацьбу за радыкальнае аздараўленне міжнароднай абстаноўкі. Надзейным компасам тут была і застаецца Праграма міру, абвешчаная XXIV і XXV з'ездамі КПСС.

Сёння становішча спраў у свеце патрабуе новых, дадатковых намаганняў, каб ліквідаваць пагрозу вайны, умацаваць міжнародную бяспеку. Дазвольце далажыць з'езду шэраг меркаванняў, што ідуць у гэтым напрамку.

За апошнія гады, як вы ведаеце, то ў адным, то ў другім раёне свету ўзнікалі ачагі ванных канфліктаў, якія нярэдка пагражалі перарасці ў вялікі пажар. Тушыць іх, як паказаў вопыт, — справа нялёгкая. Куды лепш было б ажыццяўляць прафілактыку, папярэджваць з'яўленне такіх ачагоў.

У Еўропе, напрыклад, гэтай мэце ў нейкай ступені служаць — і служаць увогуле нядрэнна — меры па ўмацаванню давер'я ў ваеннай галіне, праводзімыя па рашэнню агульнаеўрапейскай нарады. Гэта — паведамленне загадзя аб ваенных вучэннях сухапутных войск, запрашэнне на іх назіральнікаў з іншых краін. Цяпер гэтыя меры ажыццяўляюцца на тэрыторыях еўрапейскіх дзяржаў, уключаючы заходнія раёны СССР. Мы ўжо гаварылі, што гатовы пайсці далей — паведамляць і аб вучэннях ваенна-марскіх і ваенна-паветраных сіл. Мы прапаноўвалі — і зноў прапаноўваем, — каб паведамленне рабілася таксама і аб буйных перамяшчэннях войск.

А цяпер мы хочам прапанаваць істотна расшырыць і зону прымянення такіх мер. **Мы гатовы распаўсюдзіць іх на ўсю еўрапейскую частку СССР — пры ўмове адпаведнага расшырэння зоны мер давер'я і з боку заходніх дзяржаў.**

Ёсць раён, дзе распрацоўка і прымяненне мер давер'я — з улікам, зразумела, яго спецыфікі,— маглі б не толькі разрадзіць абстаноўку на месцы, але і стаць справай, вельмі карыснай для ўмацавання асноў усеагульнага міру. Гэта — Далёкі Усход, дзе суседнічаюць такія дзяржавы, як СССР, Кітай, Японія. Там ёсць таксама амерыканскія ваенныя базы. **Савецкі Саюз быў бы гатоў правесці канкрэтныя перагаворы па мерах давер'я на Далёкім Усходзе з усімі зацікаўленымі краінамі.**

Уносячы гэтыя далёка ідучыя прапановы па мерах давер'я, мы зыходзім з таго, што іх ажыццяўленне будзе садзейнічаць прагрэсу і ў справе разбраення.

Далей. Наконт унесеных намі прапаноў па Персідскаму заліву часам гавораць, што іх нельга адарваць ад пытання аб знаходжанні савецкага воінскага кантынгенту ў Афганістане. Што можна на гэта сказаць? Савецкі Саюз гатоў дагаворвацца па Персідскаму заліву як самастойнай праблеме. Гатоў, зразумела, і да ўдзелу ў асобным урэгуляванні становішча вакол Афганістана, аб чым я ўжо гаварыў вышэй. **Але мы не пярэчым і супраць таго, каб пытанні, звязаныя з Афганістанам, былі абмеркаваны ва ўвязцы з пытаннямі бяспекі Персідскага заліва.** Натуральна, пры гэтым могуць абмяркоўвацца толькі міжнародныя аспекты афганскай праблемы, а не ўнутрыафганскія справы. Суверэнітэт Афганістана павінен быць поўнасцю ахаваны, як і яго статус дзяржавы, праводзячай палітыку недалучэння.

Мы яшчэ раз настойліва заклікаем да стрыманасці ў галіне стратэгічных узбраенняў. Нельга дапусціць, каб народы свету жылі пад пагрозай развязвання ядзернай вайны.

Абмежаванне стратэгічных узбраенняў і іх скарачэнне — праблема надзвычайная. **Мы са свайго боку гатовы працягваць без прамаруджвання адпаведныя перагаворы з ЗША, з захаваннем усяго таго станоўчага, што да гэтага часу было дасягнута ў данай галіне.** Зразумела, перагаворы могуць весціся толькі на аснове роўнасці і аднолькавай бяспекі. На пагадненне, якое давала б аднабаковую перавагу ЗША, мы не пойдзем. Тут не павінна быць ілюзій. На нашу думку, у належны час у такія перагаворы павінны ўключыцца і ўсе астатнія ядзерныя дзяржавы.

СССР гатоў весці перагаворы аб абмежаванні любых відаў узбраенняў. У свой час мы прапаноўвалі забараніць

(Працяг на 6-й стар.).

Працяг даклада Л. І. БРЭЖНЕВА

стварэнне марской ракетнай сістэмы «Трайдэнт» у ЗША і адпаведнай сістэмы — у нас. Гэта прапанова не была прынята. У выніку ў амерыканцаў створана новая падводная лодка «Агайо» з ракетамі «Трайдэнт-1». Аналагічная сістэма — «Тайфун» — створана і ў нас. Ну і хто ж ад гэтага выйграў?

Мы гатовы дагаварыцца аб абмежаванні разгортвання новых падводных лодак — у ЗША тыпу «Агайо» і падобных у СССР. Мы маглі б таксама пайсці на дагаворанасць аб забароне мадэрнізацыі існуючых і стварэння новых балістычных ракет, размяшчаемых на гэтых лодках.

Цяпер аб ракетна-ядзернай зброі ў Еўропе. Ідзе ўсё больш небяспечнае яе назапашванне. Утварыўся свайго роду заганны круг: дзеянні аднаго боку выклікаюць контрмеры другога. Як разарваць гэты ланцуг?

Мы прапануем дагаварыцца аб тым, каб ужо цяпер устанавіць мараторый на размяшчэнне ў Еўропе новых ракетна-ядзерных сродкаў сярэдняй дальнасці краін НАТО і СССР, гэта значыць замарозіць у колькасных і якасных адносінах існуючы ўзровень такіх сродкаў, уключаючы, зразумела, ядзерныя сродкі перадавога базіравання ЗША ў гэтым раёне. Уступіць у сілу гэты мараторый мог бы адразу ж, як толькі пачнуцца перагаворы па данаму пытанню, і дзейнічаць, пакуль не будзе заключаны пастаянны дагавор аб абмежаванні, а яшчэ лепш—аб скарачэнні такіх ядзерных сродкаў у Еўропе. Пры гэтым мы зыходзім з таго, што абодвума бакамі будзе спынена ўсякая падрыхтоўка да разгортвання адпаведных дадатковых сродкаў, у тым ліку амерыканскіх ракет «Першынг-2» і стратэгічных крылатых ракет наземнага базіравання.

Народы павінны ведаць праўду аб тым, да якіх згубных для чалавецтва вынікаў прывяла б ядзерная вайна. **Мы прапануем, каб быў створаны аўтарытэтны міжнародны камітэт, які паказаў бы жыццёвую неабходнасць прадухілення ядзернай катастрофы.** У камітэт маглі б увайсці віднейшыя вучоныя з розных краін. Аб зробленых ім вывадах павінен быць паінфармаваны ўвесь свет.

Ёсць, зразумела, і многа іншых актуальных міжнародных праблем у сённяшнім свеце. Разумнае вырашэнне іх дало б магчымасць зняць напал міжнароднага становішча, дазволіла б народам уздыхнуць больш спакойна. Але для гэтага патрэбны дальнабачны падыход, палітычная воля і смеласць, аўтарытэт і ўплыў. Вось чаму нам уяўляецца, што было б **карысна склікаць спецыяльнае пасяджэнне Савета Бяспекі з удзелам вышэйшых кіраўнікоў дзяржаў — членаў савета, каб пашукаць ключы да аздараўлення міжнароднай абстаноўкі, недапушчэння вайны. У пасяджэнні маглі б, відаць, пры жаданні прыняць удзел і кіраўнікі іншых дзяржаў.** Вядома, запатрабавалася б грунтоўная падрыхтоўка такога пасяджэння з тым, каб забяспечыць яго станоўчыя вынікі.

Такім чынам, таварышы, прапаноўваемыя намі новыя меры ахопліваюць шырокае кола пытанняў. Яны датычаць і ракетна-ядзернай, і звычайных тыпаў зброі, і сухапутных войск, і марскіх, і паветраных сіл. Яны закранаюць становішча і ў Еўропе, і на Блізкім, на Сярэднім, на Далёкім Усходзе. У іх размова ідзе аб мерах як палітычнага, так і ваеннага характару. Усе гэтыя прапановы аб'ядноўвае адна-адзіная мэта, адно наша агульнае імкненне—зрабіць усё магчымае, каб вывесці народы з-пад пагрозы ядзернай вайны, захаваць мір на зямлі.

Гэта, калі хочаце, арганічны працяг і развіццё нашай Праграмы міру ў дастасаванні да найбольш вострых, актуальных праблем міжнароднага жыцця ў нашы дні.

Адстаяць мір — няма цяпер больш важнай задачы ў міжнародным плане для нашай партыі, нашага народа, ды і для ўсіх народаў планеты.

Адстойваючы мір, мы працуем не толькі для людзей, якія жывуць цяпер, не толькі для нашых дзяцей і ўнукаў; мы працуем для шчасця дзесяткаў будучых пакаленняў.

Калі будзе мір, творчая энергія народаў, апіраючыся на дасягненні навукі і тэхнікі, напэўна вырашыць тыя праблемы, якія цяпер хвалююць людзей. Вядома, тады перад нашымі патомкамі ўзнікнуць новыя, яшчэ больш высокія задачы. Што ж, такая дыялектыка прагрэсу, дыялектыка жыцця.

Не падрыхтоўка да вайны, асуджаючая народы на бяссэнсавую растрату сваіх матэрыяльных і духоўных багаццяў, а ўмацаванне міру—вось пуцяводная ніць у заўтрашні дзень.

ЭКАНАМІЧНАЯ ПАЛІТЫКА КПСС У ПЕРЫЯД РАЗВІТОГА САЦЫЯЛІЗМУ

Уступаючы ў сямідзесятыя гады, партыя ўсебакова прааналізавала стан народнай гаспадаркі і вызначыла галоўныя шляхі вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем развітога сацыялізму. Зыходным пунктам партыйнага, палітычнага падыходу да эканомікі служыла і служыць нязменнае праграмнае патрабаванне — усё ў імя чалавека, усё для шчасця чалавека.

Вынікі развіцця народнай гаспадаркі краіны ў 1971—1980 гадах пераканаўча пацвярджаюць правільнасць эканамічнай стратэгіі партыі. Краіна зрабіла значны крок наперад на ўсіх напрамках стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму. Якасна новага ўзроўню дасягнулі прадукцыйныя сілы савецкага грамадства. Углыбіню і ўшырыню развіваецца навукова-тэхнічная рэвалюцыя, мяняючы аблічча многіх вытворчасцей і цэлых галін. Савецкая навука займае вядучыя пазіцыі ў важнейшых галінах ведаў. Эканамічная магутнасць краіны надзейна гарантуе далейшы прагрэс на шляху камуністычнага будаўніцтва.

На працягу мінулага дзесяцігоддзя вялася настойлівая барацьба за павышэнне эфектыўнасці народнай гаспадаркі. Найбольш канцэнтраваны паказчык тут — прадукцыйнасць працы. Яна вырасла за гэты час амаль у паўтара раза. На аснове дасягненняў навукі атрымалі далейшае развіццё або створаны занава такія сучасныя галіны, як атамнае машынабудаванне, касмічная тэхніка, электронная і мікраэлектронная, мікрабіялагічная прамысловасць, лазерная тэхніка, вытворчасць штучных алмазаў, а таксама іншых новых сінтэтычных матэрыялаў.

Характэрная асаблівасць сямідзесятых гадоў — буйныя перамены ў размяшчэнні прадукцыйных сіл. У адпаведнасці з рашэннямі XXV з'езда КПСС ідзе фарміраванне тэрытарыяльна - вытворчых комплексаў у еўрапейскай частцы РСФСР, на Урале, у Сібіры, на Далёкім Усходзе, у Казахстане і Таджыкістане.

За гады дзесятай пяцігодкі гэтыя комплексы забяспечылі ўвесь агульнасаюзны прырост нафты, газу і вугалю. На паўночным захадзе Сібіры ў 1970 годзе здабыча нафты (уключаючы газавы кандэнсат) складала 31 мільён тон, а ў 1980 годзе яна перавысіла 312 мільёнаў; здабыча газу за гэты перыяд узрасла з 9,5 да 156 мільярдаў кубічных метраў. Звыш 48 мільярдаў кубічных метраў газу даюць цяпер арэнбургскія газавікі. Гарнякі Паўладар-Экібастузскага комплексу ў 1980 годзе здабылі каля 67 мільёнаў тон вугалю — амаль у тры разы больш, чым у 1970 годзе. Растучую ролю ў эканоміцы азіяцкай часткі краіны адыгрываюць Саянскі, Брацка-Усць-Ілімскі, Паўднёва-Якуцкі, Каратау-Джамбульскі, Мангышлакскі, Паўднёва-Таджыкскі тэрытарыяльна-вытворчыя комплексы. Вялікія магчымасці для руху на ўсход і поўнач адкрывае Байкала-Амурская магістраль.

Індустрыяльнае асваенне новых рэгіёнаў важна і ў сацыяльным, і ў палітычным планах. Узнікаючыя там вытворчыя калектывы нясуць з сабой высокую культуру працы і быту, новы, сучасны рытм жыцця. У летапіс гераічных здзяйсненняў савецкіх людзей упісваецца яшчэ адзін яркі раздзел.

Сямідзесятыя гады былі перыядам устойлівага росту цяжкай прамысловасці. Выпуск сродкаў вытворчасці вырас у такіх жа маштабах, як за папярэднія дваццаць гадоў. У два разы ў параўнанні з шасцідзесятымі гадамі ўзрасла выпрацоўка электраэнергіі. Да адзінай энергетычнай сістэмы краіны далучылася Аб'яднаная энергасістэма Сібіры.

Уведзены ў эксплуатацыю унікальныя гідраагрэгаты на Саяна-Шушанскай, Усць-Ілімскай, Нурэкскай, Інгурскай, Дняпроўскай, Ніжнекамскай і іншых гідрастанцыях. Завершана будаўніцтва буйнейшых цеплавых электрастанцый — Запарожскай і Углягорскай. Высокімі тэмпамі расце атамная энергетыка. У строй дзеючых уступілі новыя энергаблокі на Ленінградскай, Чарнобыльскай, Курскай, Белаярскай, Армянскай і Білібінскай атамных электрастанцыях. Атамная энергетыка атрымлівае магутную сучасную тэхніку: пачаў даваць прадукцыю «Атаммаш» — галаўны пастаўшчык ядзерных паравытворчых установак.

Працягвала ўмацоўвацца металургія краіны. За апошняе дзесяцігоддзе народная гаспадарка атрымала сталі на 460 мільёнаў тон больш, чым за папярэдняе. Ажыццёўлена шырокая праграма развіцця машынабудавання. Яго прадукцыя ў 1980 годзе ў параўнанні з 1970 годам узрасла ў 2,7 раза; выпуск прыбораў вырас у 3,3 раза, сродкаў вылічальнай тэхнікі — у 10 разоў.

Прыкметныя колькасныя і якасныя зрухі адбыліся ў хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці. Прадукцыя гэтых галін за 1971—1980 гады павялічылася больш чым у два разы. Асабліва вялікія поспехі дасягнуты ў вытворчасці мінеральных угнаенняў. Адначасова развіваецца ўвесь спектр хімічных вытворчасцей. Буйнейшыя аб'яднанні «Нітрон» і «Палімір», Томскі хімічны завод, Прыкумскі, Омскі і Шаўчэнкаўскі заводы пластмас і рад іншых новых прадпрыемстваў утвараюць ядро сучаснай хімічнай індустрыі.

За мінулыя дзве пяцігодкі сур'ёзна ўмацавана тэхнічная база сельскагаспадарчай вытворчасці. Узмацніліся хімізацыя, комплексная механізацыя і індустрыялізацыя земляробства і жывёлагадоўлі. У шырокіх маштабах вядуцца меліярацыйныя работы. Каб ажыццявіць гэтыя няпростыя задачы, павялічаны капітальныя ўкладанні ў аграрны сектар эканомікі. За дзесяць гадоў яны склалі больш як 300 мільярдаў рублёў. Гэта ў 2,3 раза больш, чым у папярэднім дзесяцігоддзі.

Інтэнсіфікацыя сельскай гаспадаркі дала магчымасць — нават пры скарачэнні колькасці работнікаў — няўхільна павялічваць аб'ём прадукцыі. У разліку на адзін гектар ён вырас у мінулым дзесяцігоддзі ў параўнанні з папярэднім у 1,3 раза.

Другі эфект інтэнсіфікацыі — вялікая ўстойлівасць сельскай гаспадаркі. Нягледзячы на тое, што з пяці апошніх гадоў тры былі неспрыяльнымі, сярэднегадавы збор збожжа дасягнуў 205 мільёнаў тон. Збор бавоўны ў 1980 годзе склаў амаль дзесяць мільёнаў тон. У цэлым за дзевятую і дзесятую пяцігодкі сельскагаспадарчай прадукцыі атрымана на 272 мільярды рублёў больш, чым за дзве папярэднія.

Рост эканамічнай магутнасці Савецкай дзяржавы даў магчымасць выканаць у сямідзесятыя гады шырокую праграму ўздыму народнага дабрабыту. 32 мільярды рублёў было выдзелена на ажыццяўленне агульнадзяржаўных мерапрыемстваў па павышэнню заработнай платы, пенсій, дапамог і г. д. І кожнае такое мерапрыемства — гэта рэальны, важкі зрух на галоўным для нас напрамку — зрабіць лепшым жыццё савецкіх людзей.

Павышаны мінімальная зарплата, стаўкі і аклады сярэднеаплатных рабочых і служачых ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Сярэднемесячная заработная плата перавысіла ў 1980 годзе 168 рублёў і павялічылася ў параўнанні з 1970 годам амаль у 1,4 раза. Яшчэ больш высокімі тэмпамі расла аплата працы калгаснікаў. Амаль у два разы павялічыліся выплаты і льготы з грамадскіх фондаў спажывання.

У дзевятай і дзесятай пяцігодках павышаны мінімальныя размеры пенсій рабочым, служачым, калгаснікам. Палепшаны матэрыяльна-бытавыя ўмовы жыцця ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Уведзены дапамогі на дзяцей з малазабяспечаных сем'яў. Павялічаны стыпендыі студэнтам ВНУ, навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і тэхнічных вучылішчаў. Вучні першых пяці класаў сталі атрымліваць падручнікі бясплатна.

Самыя непасрэдныя адносіны да жыццёвага ўзроўню мае вытворчасць тавараў народнага спажывання. За сямідзесятыя гады яна павялічылася ў параўнанні з папярэднім дзесяцігоддзем амаль у два разы. Тым не менш тут, як і ў забеспячэнні насельніцтва прадуктамі харчавання, ёсць праблемы і недапрацоўкі.

У сямідзесятыя гады пабудаваны жылыя дамы, плошча якіх перавышае ўвесь гарадскі жыллёвы фонд у пачатку шасцідзесятых гадоў. Размах жыллёвага будаўніцтва — гэта, таварышы, наша вялікае сацыяльнае дасягненне.

Такім чынам, галоўная мэтавая ўстаноўка эканамічнай стратэгіі партыі паслядоўна ажыццяўляецца. Пры ўсёй складанасці паўстаючых тут пытанняў курс, намечаны партыяй, няўхільна праводзіцца ў жыццё.

У цэлым 70-я гады можна ацаніць як буйны крок у развіцці народнай гаспадаркі краіны, усіх саюзных і аўтаномных рэспублік.

Краіна ўступіла ў новае дзесяцігоддзе, маючы магутны эканамічны і навукова-тэхнічны патэнцыял, шматмільённую армію падрыхтаваных, адданых справе кадраў.

У 80-я гады, як вы ведаеце, будзе дзейнічаць рад фактараў, якія ўскладняюць эканамічнае развіццё. Адзін з іх — скарачэнне прыросту працоўных рэсурсаў. Другі — павелічэнне затрат у сувязі з асваеннем Усходу і Поўначы, а таксама непазбежны рост расходаў на ахову навакольнага асяроддзя. Да гэтага трэба дадаць, што існуе нямала старых прадпрыемстваў, якія патрабуюць карэннай перабудовы.

У праекце Асноўных напрамкаў увасоблена пераемнасць эканамічнай стратэгіі партыі. У ім улічваюцца і канкрэтныя ўмовы, у якіх будзе развівацца краіна. Іменна пад гэтым вуглом гледжання вызначаны мэты эканамічнага росту і асноўныя шляхі іх дасягнення.

«Галоўная задача адзінаццатай пяцігодкі,— гаворыцца ў праекце,— **заключаецца ў забеспячэнні далейшага росту дабрабыту савецкіх людзей на аснове ўстойлівага, паступальнага развіцця народнай гаспадаркі, паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу і пераводу эканомікі на інтэнсіўны шлях развіцця, больш рацыянальнага выкарыстання вытворчага патэнцыялу краіны, усямернай эканоміі ўсіх відаў рэсурсаў і паляпшэння якасці работы».**

Безумоўнай перадумовай вырашэння ўсіх народнагаспадарчых задач — і вытворчых, і сацыяльных — з'яўляецца развіццё цяжкай індустрыі. Асабліва гэта датычыць яе базавых галін, у першую чаргу — **паліўна-энергетычных.** Дакладчык падкрэсліў, што ўсё больш актуальнай становіцца задача паляпшаць структуру паліўна-энергетычнага балансу.

У новай пяцігодцы буйныя асігнаванні выдзяляюцца на развіццё **металургіі** — чорнай і каляровай. Мы, вядома, будзем уводзіць у дзеянне новыя металургічныя магутнасці. Але для пераадолення дэфіцыту металу існуе і другі шлях — больш умелае і поўнае выкарыстанне таго, што вырабляецца.

Новая пяцігодка будзе сур'ёзным экзаменам для **будаўнікоў.** Характэрная яе рыса — усямерная канцэнтрацыя сіл на хутчэйшым завяршэнні і пуску тых прадпрыемстваў, якія здольны забяспечыць найбольшы прырост прадукцыі, расшыць вузкія месцы. Мы ўжо ўзялі гэты курс, і яго трэба няўхільна прытрымлівацца.

Спецыяльна павінен спыніцца на рабоце **транспарту.** Улічваючы сур'ёзнасць і маштабы існуючых на транспарце праблем, мы прыйшлі да вываду, што вырашыць іх магчыма толькі на аснове даўгачаснай комплекснай праграмы. Распрацоўка такой праграмы прадугледжана Асноўнымі напрамкамі.

Перад кожнай галіной стаяць свае актуальныя задачы і спецыфічныя праблемы. Але ёсць праблемы, якія ахопліваюць усе сферы народнай гаспадаркі, і галоўная з іх — завяршыць пераход на пераважна інтэнсіўны шлях развіцця.

У народную гаспадарку ўключаны сапраўды велізарныя рэсурсы, сказаў дакладчык. Не раз адзначалася, што СССР выйшаў на першае месца ў свеце па вытворчасці многіх важных відаў прадукцыі. Мы перавышаем іншыя краіны па колькасці інжынераў. І ўсім гэтым, таварышы, можна ганарыцца.

Нам цяпер пад сілу вырашэнне самых вялікіх і складаных задач. Але стрыжнем эканамічнай палітыкі становіцца справа, здавалася б, простая і вельмі будзённая — гаспадарскія адносіны да грамадскага дабра, уменне поўнасцю, мэтазгодна выкарыстаць усё, што ў нас ёсць. На гэта павінны быць нацэлены ініцыятыва працоўных калектываў, партыйна-масавая работа. На гэта павінны быць нацэлены і тэхнічная палітыка, і палітыка капіталаўкладанняў, і сістэма планавых, справаздачных паказчыкаў.

Умовы, у якіх народная гаспадарка будзе развівацца ў 80-я гады, робяць яшчэ больш неабходным паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу. У вялікім значэнні навукі пераконваць нікога не прыходзіцца. Партыя камуністаў зыходзіць з таго, што будаўніцтва новага грамадства без навукі проста немагчыма.

Цэнтральны Камітэт КПСС выступае за тое, каб і ў далейшым павышаць ролю і адказнасць Акадэміі навук СССР, паляпшаць арганізацыю ўсёй сістэмы навуковых даследаванняў.

Рашаючы, найбольш востры ўчастак сёння — укараненне навуковых адкрыццяў і вынаходстваў.

Сёння, заглядваючы наперад на пяць,

[Заканчэнне на 7-й стар.].

Заканчэнне даклада Л. І. БРЭЖНЕВА

на дзесяць гадоў, мы не можам забываць, што іменна ў гэтыя гады будзе закладвацца і ствараццa народнагаспадарчая структура, з якой краіна ўступіць у дваццаць першае стагоддзе. Яна павінна ўвасабляць асноўныя рысы і ідэалы новага грамадства, быць у авангардзе прагрэсу, увасабляць у сабе інтэграцыю навукі і вытворчасці, непарушны саюз творчай думкі і творчай працы.

На адзінаццатую пяцігодку і васьмідзесятыя гады ў цэлым партыя вызначае шырокую праграму далейшага ўздыму дабрабыту народа. Гэта праграма ахоплівае паляпшэнне ўсіх бакоў жыцця савецкіх людзей — спажыванне і жыллё, культуру і адпачынак, умовы працы і быту. Цяпер, як лічыць Цэнтральны Камітэт КПСС, на першы план ставіцца задача палепшыць забеспячэнне насельніцтва прадуктамі харчавання, а таксама прамысловымі таварамі шырокага спажывання.

У мэтах радыкальнага вырашэння праблемы прызнана неабходным распрацаваць спецыяльную **харчовую праграму.** Яна павінна забяспечыць значнае павелічэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Яна павінна цясней самкнуць сельскую гаспадарку з галінамі, якія займаюцца захоўваннем і перапрацоўкай яе прадукцыі. І, вядома, з гандлем. Інакш кажучы, яе мэта — у магчыма больш сціслыя тэрміны вырашыць задачу бесперабойнага забеспячэння насельніцтва прадуктамі. Работа над праграмай толькі пачалася, і тым больш падстаў завастрыць увагу на пастаўленых тут пытаннях.

Эканамічная палітыка, якую вызначае партыя на адзінаццатую пяцігодку і 80-я гады, адлюстроўвае карэнныя, жыццёвыя інтарэсы савецкага народа, адзначаецца ў дакладзе. Спалучаючыся, зліваючыся з творчасцю, ініцыятывай, энергіяй мас, яна забяспечвае няўхільны рух нашага грамадства па шляху росту дабрабыту працоўных, стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму.

САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАЕ І ДУХОЎНАЕ РАЗВІЦЦЁ САВЕЦКАГА ГРАМАДСТВА І ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ

Ва ўмовах сталага сацыялізму ўсё больш цеснай становіцца ўзаемасувязь прагрэсу эканомікі з сацыяльна-палітычным і духоўным прагрэсам грамадства. Выходзячы з гэтага, Цэнтральны Камітэт КПСС удзяляў пастаянную ўвагу пытанням развіцця сацыяльна-класавай і нацыянальнай структуры савецкага грамадства, удасканаленню сацыялістычнага ладу жыцця, нашай дзяржаўнасці і дэмакратыі.

У 70-я гады працягвалася **збліжэнне ўсіх класаў і сацыяльных груп савецкага грамадства.**

Павышаецца роля **рабочага класа** ў жыцці грамадства. Расце яго колькасць. Цяпер у краіне каля 80 мільёнаў рабочых — дзве трэці занятага насельніцтва. Значыць, рабочы клас стаў у нас не проста самым шматлікім класам, але і большасцю працоўнага народа. У састаў партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх камітэтаў, вышэйшых і мясцовых органаў дзяржаўнай улады прыходзіць усё больш рабочых. Гэта вельмі правільна, таварышы, гэта мы вітаем!

Умацаванне вядучай ролі рабочага класа, безумоўна, звязана з ростам яго ідэйна-палітычнай сталасці, адукаванасці і прафесіянальнай кваліфікацыі.

Па меры індустрыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці глыбокія перамены адбываюцца ў жыцці **калгаснага сялянства.** Яго праца паступова збліжаецца з працай рабочых. На сацыяльную структуру вёскі вялікі ўплыў аказвае збліжэнне дзвюх форм сацыялістычнай уласнасці, развіццё міжгаспадарчых арганізацый, у якіх удзельнічаюць і калгасы, і дзяржаўныя прадпрыемствы.

Хутчэй за ўсіх у справаздачны перыяд расла колькасць нашай **інтэлігенцыі.** Цяпер у краіне кожны чацвёрты работнік звязаны ў асноўным з разумовай працай.

Ацэньваючы вопыт развіцця нашага грамадства за апошнія дзесяцігоддзі, можна, я думаю, дапусціць, што станаўленне бясклясавай структуры грамадства ў галоўным і асноўным адбудзецца ў гістарычных рамках сталага сацыялізму.

Вядучай сілай гэтага працэсу, яго, гаворачы словамі Маркса, «сацыяльным розумам і сацыяльным сэрцам», быў і застаецца сучасны рабочы клас. Яго рэвалюцыйная ідэалогія і мараль, калектывісцкая псіхалогія, яго інтарэсы і ідэалы становяцца цяпер набыткам усіх слаёў савецкага грамадства.

Сціранне міжкласавых адрозненняў ставіць, натуральна, новыя задачы перад сацыяльнай палітыкай. У гэтай сувязі хачу падкрэсліць неабходнасць **выроўнівання сацыяльных адрозненняў, так сказаць, у тэрытарыяльным плане.** У розных раёнах нашай велізарнай краіны культурна-бытавыя ўмовы жыцця людзей неаднолькавыя. Іменна такія адрозненні нярэдка ўскладняюць становішча з працоўнымі рэсурсамі ў радзе месц.

У адпаведнасці з указаннямі XXV з'езда партыі Цэнтральны Камітэт удзяляў сур'ёзную ўвагу распрацоўцы і ажыццяўленню эфектыўнай **дэмаграфічнай палітыкі,** праблемам народанасельніцтва, якія абвастрыліся за апошні час. Галоўны шлях іх вырашэння — узмацненне клопатаў аб сям'і, маладажонах і перш за ўсё аб жанчыне.

У дзесятай пяцігодцы быў прыняты рад мер па паляпшэнню ўмоў працы працуючых жанчын, сямейнага адпачынку, бытавога і культурнага абслугоўвання. Трэба, аднак, прама сказаць: прыкметнага пералому пакуль што не адбылося. Патрэбны больш шырокія і дзейсныя меры. І яны, як вядома, намячаюцца ў Асноўных напрамках.

І яшчэ аб адной групе насельніцтва — аб пенсіянерах. У апошні час мы павысілі размеры пенсій. Аднак гэтыя надбаўкі не закранулі асоб, якія пайшлі на адпачынак раней. Пачынаючы з новай пяцігодкі, такое становішча намячаецца паступова папраўляць.

Няўхільна ўмацоўваецца брацкая дружба ўсіх народаў нашай шматнацыянальнай Радзімы. Наш курс — нарошчванне матэрыяльнага і духоўнага патэнцыялу кожнай рэспублікі і разам з тым яго максімальнае выкарыстанне для гарманічнага развіцця ўсёй краіны. На гэтым шляху мы дабіліся сапраўды гістарычных дасягненняў.

З першых гадоў Савецкай улады наша эканамічная і сацыяльная палітыка будавалася так, каб як мага хутчэй узняць былыя нацыянальныя ўскраіны Расіі да ўзроўню развіцця яе цэнтра. І гэта задача была паспяхова вырашана. Важнейшую ролю тут адыгралі цеснае супрацоўніцтва ўсіх нацый краіны і перш за ўсё бескарыслівая дапамога рускага народа. Адсталых нацыянальных ускраін цяпер не існуе!

Адзінства савецкіх нацый сёння трывалае, як ніколі.

У нашай краіне паважаюцца нацыянальныя пачуцці, нацыянальная годнасць кожнага чалавека. КПСС змагалася і заўсёды будзе рашуча змагацца супраць такіх чужых прыродзе сацыялізму праяўленняў, як шавінізм або нацыяналізм, супраць любых нацыяналістычных вывіхаў, няхай гэта будзе, скажам, антысемітызм або сіянізм.

Свяшчэнны абавязак партыі — выхоўваць працоўных у духу савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, гордага пачуцця прыналежнасці да адзінай вялікай Савецкай Радзімы.

Жыццё пераконвае, што інтэнсіўнае эканамічнае і сацыяльнае развіццё кожнай з нашых рэспублік паскарае працэс іх усебаковага збліжэння. Ён ідзе ў нас так, як і павінен ісці пры сацыялізме: на аснове роўнасці, брацкага супрацоўніцтва і добраахвотнасці. За захаваннем гэтых ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі партыя сочыць строга. Ад іх мы не адступім ніколі!

Савецкае грамадства — гэта грамадства людзей **працы.** Партыя і дзяржава прыкладалі і прыкладаюць шмат намаганняў, каб зрабіць працу чалавека не толькі больш прадукцыйнай, але і змястоўнай, цікавай, творчай. І важнейшую ролю тут заклікана адыграць ліквідацыя ручной, малакваліфікаванай і цяжкай фізічнай працы.

Сацыялізм нараджае новыя адносіны да працы. Адным з яркіх іх праяўленняў было і застаецца сацыялістычнае спаборніцтва.

Зразумела ўсім, што людзі працуюць лепш, больш ахвотна там, дзе яны адчуваюць пастаянныя клопаты аб паляпшэнні ўмоў іх працы і быту.

Прадметам асаблівай увагі партыі была і застаецца **сфера размеркавання.** Галоўным крытэрыем размеркавання пры сацыялізме можа быць толькі праца — яе колькасць і якасць. На жаль, на практыцы не заўсёды бывае так.

Наша сістэма матэрыяльных і маральных стымулаў павінна заўсёды і ўсюды забяспечваць справядлівую і аб'ектыўную ацэнку працоўнага ўкладу кожнага.

Адна з самых характэрных рыс савецкага ладу жыцця — растучыя дабароты, якія людзі атрымліваюць з **грамадскіх фондаў спажывання.** За пяцігоддзе яны павялічыліся прыблізна на адну трэць і толькі ў адным бягучым годзе складуць 121,5 мільярда рублёў. Гэта велізарныя сродкі.

Важнейшае месца ў нашай сацыяльнай праграме займае, як вядома, **жыллё.** Ужо адзначалася, што ў мінулай пяцігодцы жыллёвае будаўніцтва вялося з велізарным размахам; яго аб'ёмы па краіне захаваюцца і ў далейшым.

У справаздачны перыяд у цэлым паспяхова выконваліся ўказанні XXV з'езда партыі, якія датычаць **развіцця народнай асветы.**

Узяты важны рубеж — завершаны пераход да абавязковай усеагульнай сярэдняй адукацыі. Галоўнае сёння ў тым, каб павысіць якасць навучання, працоўнага і маральнага выхавання ў школе, зжыць фармалізм у ацэнцы вынікаў працы настаўнікаў і вучняў, на справе ўмацаваць сувязь навучання з жыццём, палепшыць падрыхтоўку школьнікаў да грамадска карыснай працы.

XXV з'езд назваў клопаты аб **здароўі савецкіх людзей** адной з самых важных сацыяльных задач. ЦК КПСС і ўрад прынялі ў 1977 годзе разгорнутую пастанову аб мерах па далейшаму паляпшэнню народнай аховы здароўя. Яе ажыццяўленне дае свае вынікі. Сёння нашы паліклінікі за адну змену могуць прыняць на паўмільёна грамадзян больш, чым пяць гадоў таму назад.

Клопаты аб здароўі людзей неаддзельныя ад развіцця **фізічнай культуры і спорту.** Для большасці людзей спорт застаецца пакуль што толькі відовішчам. Такое становішча трэба выпраўляць. Фізічная культура павінна ўваходзіць у штодзённае жыццё шырокіх слаёў насельніцтва і асабліва дзяцей.

У тым, што духоўнае жыццё савецкага грамадства становіцца ўсё больш разнастайным і багатым, — бясспрэчная заслуга нашых дзеячаў культуры, нашай **літаратуры і мастацтва.** У савецкім мастацтве паднімаецца новая прыліўная хваля. У апошнія гады — прычым ва ўсіх рэспубліках — паявілася нямала таленавітых твораў. Гэта адносіцца да літаратуры і тэатра, кіно і музыкі, жывапісу і скульптуры.

Нашы крытыкі, літаратурныя часопісы, творчыя саюзы і ў першую чаргу іх партыйныя арганізацыі павінны ўмець папраўляць тых, каго заносіць у той ці іншы бок. І, вядома, актыўна, прынцыпова выступаць у тых выпадках, калі паяўляюцца творы, якія знеслаўляюць нашу савецкую рэчаіснасць. Тут мы павінны быць непрымірымымі. Партыя не была і не можа быць абыякавай да ідэйнай накіраванасці нашага мастацтва.

Верная ленінскай культурнай палітыцы, наша партыя беражліва і ўважліва адносіцца да мастацкай інтэлігенцыі, арыентуе яе на вырашэнне высокіх творчых задач. Гэта садзейнічае далейшай кансалідацыі творчых сіл, уздыму духоўнага жыцця грамадства. І няма сумнення, што савецкія майстры культуры парадуюць нас новымі мастацкімі адкрыццямі!

Найбольш істотныя змены ў эканамічным, сацыяльным і духоўным жыцці савецкага грамадства, глыбокі дэмакратызм агульнанароднай дзяржавы знайшлі канцэнтраванае выражэнне ў новай Канстытуцыі СССР.

З прыняццем Канстытуцыі СССР, а затым — канстытуцый саюзных і аўтаномных рэспублік пачаўся новы этап у рабоце **Саветаў народных дэпутатаў.** Спалучаючы заканадаўства, кіраванне і кантроль, Вярхоўныя Саветы актыўна накіроўваюць работу Саветаў Міністраў, міністэрстваў і ведамстваў. Вялікі карысны эфект дае праводзімае на аснове Канстытуцыі абнаўленне савецкага заканадаўства.

Шмат цікавага, новага паявілася ў дзейнасці мясцовых Саветаў.

Неабходная састаўная частка савецкай дэмакратыі — усеабдымны **народны кантроль** за работай органаў кіравання і службовых асоб. Ні адно парушэнне, ні адзін факт злоўжыванняў, марнатраўства, недысцыплінаванасці не павінны выпадаць з-пад увагі гаспадарскага вока народных кантралёраў.

Ва ўмацаванні сацыялістычнай законнасці і правапарадку высокая адказнасць **органаў юстыцыі, суда, пракуратуры, савецкай міліцыі.** У гэтай справе органам, якія ахоўваюць правапарадак, будзе забяспечана поўная падтрымка партыі і, не сумняваюся, усёй нашай грамадскасці.

Вастрыня класавай барацьбы на міжнароднай арэне прад'яўляе высокія патрабаванні да дзейнасці **органаў дзяржаўнай бяспекі,** да партыйнай загартоўкі, ведаў і стылю работы нашых чэкістаў. Камітэт Дзяржбяспекі СССР працуе аператыўна, на высокім прафесіянальным узроўні, строга прытрымліваючыся палажэнняў Канстытуцыі, норм савецкага заканадаўства.

У справаздачны перыяд партыя і дзяржава ні на адзін дзень не ўпускалі з поля зроку пытанні **ўмацавання абаронай магутнасці краіны, яе Узброеных Сіл.** Да гэтага нас абавязвае міжнароднае становішча.

Трывалы сплаў высокай тэхнічнай аснашчанасці, воінскага майстэрства і несакрушальнага маральнага духу — такі баявы патэнцыял Савецкіх Узброеных Сіл.

Канстытуцыя СССР значна ўзняла тую ролю, якая належыць у развіцці нашай дэмакратыі грамадскім арганізацыям. Самая масавая з іх — **прафесіянальныя саюзы.** Прыняўшы ў свае рады мільёны калгаснікаў, прафсаюзы ахопліваюць цяпер практычна ўсіх працоўных.

Партыя разглядае прафсаюзы як сваю надзейную апору ў масах, магутны сродак развіцця дэмакратыі, уцягнення працоўных у будаўніцтва камунізму. «Сувязь з масай, гэта значыць з велізарнай большасцю, рабочых (а затым і ўсіх працоўных) з'яўляецца самай важнай, самай асноўнай умовай поспеху якой бы там ні было дзейнасці прафсаюзаў», — вучыў Ленін. І няхай кожны прафсаюзны работнік заўсёды і ва ўсім звярае свае справы з гэтым ленінскім запаветам!

Больш 40 мільёнаў юнакоў і дзяўчат аб'ядноўвае **Ленінскі камсамол.** Садзейнічаць фарміраванню пакаленняў людзей палітычна актыўных, ведаючых справу, любячых працу і ўмеючых працаваць, заўсёды гатовых да абароны сваёй Радзімы, — вось самае важнае, самае галоўнае ў рабоце камсамола. У цэлым камсамол з гэтай задачай спраўляецца.

ПАРТЫЯ—АВАНГАРД САВЕЦКАГА НАРОДА

Разам з развіццём нашага грамадства, змяненнем яго сацыяльна-палітычнага і культурнага аблічча расце, мацнее, мужнее партыя камуністаў.

У цэлым за справаздачны перыяд колькасць членаў КПСС павялічылася на 1,8 мільёна чалавек. Цяпер у партыі 17 мільёнаў 480 тысяч камуністаў.

За пяць мінулых гадоў у рады КПСС прыйшлі звыш паўтара мільёна лепшых прадстаўнікоў рабочага класа, гэта значыць 59 працэнтаў усяго партыйнага папаўнення. Сярод новапрынятых больш чым 10 працэнтаў склалі калгаснікі. Працягваўся прыток у партыю прадстаўнікоў савецкай інтэлігенцыі. Амаль тры чвэрці ўступіўшых у КПСС за гэтыя гады — члены Ленінскага камсамола.

У партыю прыходзяць лепшыя, перадавыя прадстаўнікі савецкага народа.

Цэнтральны Камітэт лічыць неабходным паставіць на абмеркаванне з'езда яшчэ адно буйное пытанне агульнапартыйнага значэння. Дзеючая цяпер Праграма КПСС у цэлым правільна адлюстроўвае заканамернасці грамадскага развіцця. Але з моманту яе прыняцця мінула дваццаць гадоў. За гэты час набыты вялікі вопыт сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва ў СССР.

Відаць, у Праграме трэба ясна раскрыць змены, якія адбыліся ў структуры нашай эканомікі, падкрэсліць і ўдакладніць задачы даўгачаснага парадку.

На міжнароднай арэне таксама ўзнікла многа новых, прынцыпова важных з'яў і працэсаў.

Нам, відаць, **трэба было б унесці неабходныя змяненні і дапаўненні ў дзеючую Праграму. Калі такая прапанова атрымае падтрымку дэлегатаў з'езда, то можна было б даручыць Цэнтральнаму Камітэту падрыхтаваць новую рэдакцыю Праграмы КПСС.**

Велічная наша мэта — камунізм. І кожны працоўны поспех, кожны год гераічных здзяйсненняў, кожная пяцігодка набліжаюць нас да гэтай мэты.

(Даклад Л. І. Брэжнева быў выслуханы з вялікай увагай і неаднаразова перапыняўся бурнымі апладысментамі. Заключныя словы даклада былі сустрэты бурнай, доўга не змаўкаючай авацыяй).

ЦІ МОЖНА ЗАБЫЦЬ ВАЙНУ?

Паважаныя чытачы!

Сёлета, 22 чэрвеня, спаўняецца 40 гадоў з дня вераломнага нападу фашысцкай Германіі на нашу Радзіму — пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Шмат гора і пакут, горкіх страт прынесла нашаму народу вайна. Яна знявечыла не толькі нашу прыгожую зямлю, яе гарады і вёскі, але і скалечыла многа людскіх душ, паглынула ў сваім агні шмат чалавечых жыццяў. Вайна адыграла ракавую ролю і ў лёсах многіх з вас, нашы суайчыннікі. Памяць аб цяжкіх стратах, аб мужнасці і гераізме савецкіх воінаў, якія цаною ўласных жыццяў вызвалілі Радзіму і выратавалі Еўропу ад фашысцкай чумы, жыве ў нашым народзе, свята захоўваецца ўсімі пакаленнямі савецкіх людзей.

Аднак у заходніх краінах, нават тых, што былі нашымі саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі, настойліва выказваецца думка, што пасля заканчэння другой сусветнай вайны прайшло многа часу і таму аб ёй ужо даўно варта забыць.

Як думаеце вы, ці лёгка забыць пра вайну нашаму народу, які страціў 20 мільёнаў сваіх сыноў і дачок? Ці мае ён на гэта права? Ці могуць выкрасліць вайну са сваёй памяці палякі, чэхі, немцы, французы і іншыя народы Еўропы?

Нам хацелася б, паважаныя чытачы, каб вы напісалі пра тое, як адбілася вайна на вашым жыцці.

Колькі вам было гадоў, калі пачалася вайна?

Ці запомнілі вы першы дзень Вялікай Айчыннай вайны? Якім ён застаўся ў вашай памяці?

Многіх з вас вайна пазбавіла Радзімы. Як гэта здарылася? Што вы адчувалі, калі даведаліся аб Перамозе, аб заканчэнні вайны?

Магчыма, вы, як і многія нашы суайчыннікі, выехалі за граніцу яшчэ да Вялікага Кастрычніка ці ў міжваенны час з Заходняй Беларусі. Як вы сустрэлі паведамленне аб нападзе фашыстаў на вашу Радзіму?

Некаторыя з нашых землякоў ваявалі супраць фашысцкай Германіі ў саставе армій нашых саюзнікаў. Ці былі вы на фронце? Калі былі, то дзе і ў якіх аперацыях прымалі ўдзел?

У Канадзе і ЗША, напрыклад, нашы землякі арганізавалі камітэты дапамогі Радзіме. Ці прымалі вы ўдзел у рабоце падобных арганізацый?

Тэма вайны — народных пакут і мужнасці — з'яўляецца адной з вядучых у сучаснай беларускай літаратуры, у мастацтве. Назавіце аўтараў, чые творы вас найбольш уразілі. Чаму? Ці сустракаліся вам на старонках кніг, у кіно, на жывапісных палотнах і графічных аркушах сітуацыі, падобныя тым, якія вы перажылі ў гады вайны?

Што ведаюць аб Вялікай Айчыннай вайне вашы дзеці?

Вось ужо больш як 35 гадоў наша Радзіма, народы Еўропы жывуць пад мірным небам. Але, на жаль, ёсць яшчэ на зямлі сілы, якія імкнуцца ўцягнуць свет у новую, цяпер ужо тэрмаядзерную вайну. Што робіце вы, каб не адбылося гэтай катастрофы? Як народ краіны, дзе вы жывяце, змагаецца за мір і раззбраенне?

Будзем удзячны, паважаныя чытачы, калі вы адкажаце на нашы пытанні.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ
ГАЗЕТЫ «ГОЛАС РАДЗІМЫ».

Уважаемые читатели!

В этом году, 22 июня, исполняется 40 лет со дня вероломного нападения фашистской Германии на нашу Родину — начала Великой Отечественной войны. Много горя и страданий, горьких утрат принесла нашему народу война. Она изувечила не только нашу прекрасную землю, ее города и деревни, но и искалечила много людских душ, поглотила в своем огне много человеческих жизней. Война сыграла роковую роль и в судьбах многих из вас, наши соотечественники. Память о тяжелых утратах, о мужестве и героизме советских воинов, ценою собственной жизни освободивших Родину и спасших Европу от фашистской чумы, живет в нашем народе, свято хранится всеми поколениями советских людей.

Однако в западных странах, даже тех, что были нашими союзниками по антигитлеровской коалиции, настойчиво высказывается мнение, что после окончания второй мировой войны прошло много времени и потому о ней уже давно пора забыть.

Как вы думаете, легко ли забыть войну нашему народу, потерявшему 20 миллионов своих сыновей и дочерей? Имеет ли он на это право? Могут ли вычеркнуть войну из своей памяти поляки, чехи, немцы, французы и другие народы Европы?

Нам хотелось бы, уважаемые читатели, чтобы вы написали о том, как отразилась война на вашей жизни.

Сколько вам было лет, когда началась война?

Запомнили ли вы первый день Великой Отечественной войны? Каким он остался в вашей памяти?

Многих из вас война лишила Родины. Как это случилось? Что вы почувствовали, узнав о Победе, об окончании войны?

Возможно, вы, как и многие наши соотечественники, выехали за границу еще до Великого Октября или в межвоенное время из Западной Белоруссии. Как вы встретили известие о нападении фашистов на вашу Родину?

Некоторые из наших земляков воевали против фашистской Германии в составе армий наших союзников. Были ли вы на фронте? Если были, то где и в каких операциях принимали участие?

В Канаде и США, например, наши земляки организовали комитеты помощи Родине. Принимали ли вы участие в работе подобных организаций?

Тема войны — народных страданий и мужества — является одной из ведущих в современной белорусской литературе, в искусстве. Назовите авторов, чьи произведения вас наиболее поразили. Почему? Встречались ли вам на страницах книг, в кино, на живописных полотнах и графических листах ситуации, подобные тем, которые вы пережили в годы войны?

Что знают о Великой Отечественной войне ваши дети?

Вот уже более 35 лет наша Родина, народы Европы живут под мирным небом. Но, к сожалению, есть еще на земле силы, стремящиеся ввергнуть мир в новую, теперь уже термоядерную войну. Что делаете вы, чтобы не произошло этой катастрофы? Как народ страны, где вы живете, борется за мир и разоружение?

Будем благодарны, уважаемые читатели, если вы ответите на наши вопросы.

РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ
ГАЗЕТЫ «ГОЛАС РАДЗІМЫ».

З АПОШНІХ ВЕРНІСАЖАЎ

У Маскве, у Цэнтральнай выставачнай зале, напярэдадні XXVI з'езда КПСС адкрылася мастацкая выстаўка «Мы будуем камунізм». Свае лепшыя творы для яе паслалі жывапісцы, скульптары, графікі, майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з усіх рэспублік Краіны Саветаў. Экспазіцыя ўключае звыш 1 500 твораў.

Як значную культурную падзею адзначыла гэту выстаўку грамадскасць сталіцы, яе наведалі многія дэлегаты і госці партыйнага з'езда. У пераканаўчых мастацкіх вобразах тут адлюстравалася імклівае жыццё нашай шматнацыянальнай краіны, яе прыгажосць і багацце. У цэнтры ўвагі — людзі стваральнай працы, чыімі нястомнымі рукамі і дапытлівым розумам пераўтвараецца зямля, узводзяцца новыя гарады, робяцца навуковыя адкрыцці, назапашваюцца для чалавецтва маральныя каштоўнасці.

Сярод твораў, якія карыстаюцца павышанай увагай наведвальнікаў, «Сказ пра хлеб» народнага мастака СССР Міхаіла Савіцкага. Гэтае жывапіснае палатно — гімн хлебу, адвечнай сялянскай працы — было паказана ўсёй краіне ў тэлерэпартажы з адкрыцця новай экспазіцыі ў Цэнтральнай выставачнай зале Масквы. Паказанае на выстаўцы пераканаўча сведчыць: савецкае грамадства дбае пра дабрабыт і душэўную прыгажосць кожнага чалавека, дае магчымасці для росквіту ўсіх талентаў.



НА ЗДЫМКАХ: работы беларускіх мастакоў. М. РЫЖЫКАЎ. «Песня» з серыі «Камунары»; Л. ДУДАРАНКА. «Пісьменнік Васіль Быкаў»; У. ЛЯТУН. «Камбайнер Васіль Канопліч»; А. ПАСЛЯДОВІЧ. «Нацюрморт са званочкамі».

Спорт

ПЕРШЫЯ МЕДАЛІ

У Мінску пачаўся зімні чэмпіянат краіны па лёгкай атлетыцы сярод сельскіх спартсменаў. Першыя залатыя медалі заваявалі беларускія атлеты. Трашчыла перамог у бегу на 1 500 метраў, а Марфіеня быў мацнейшым у скачках у даўжыню.

* * *

Добрымі вынікамі парадавалі юніёры, якія ўдзельнічалі ў першынстве Савецкага Саюза па кіданнях, што адбылося ў Леселідзе. Сярод прызёраў нямала прадстаўнікоў нашай рэспублікі.

У кіданні кап'я перамог віцябчанін Грыцкевіч, далей за ўсіх паслаў дыск гамяльчанін Савасцюк. Бронзавыя ўзнагароды ў гэтым відзе спорту заваявалі Юрава з Гомеля і Мішукоў з Мінска.

НАРОЎНІ З ЧЭМПІЁНАМ

Пачаліся гульні на Кубак СССР па футболу. Гонар нашай рэспублікі абараняюць «Дынама» (Мінск) і «Хімік» (Гродна).

Першую сустрэчу мінчане правялі са «Спартаком» з Арджанікідзе. Нягледзячы на перавагу беларускіх футбалістаў, гульня завяршылася ўнічыю — 0:0.

Грозны сапернік дастаўся гродзенскаму «Хіміку» — шматразовыя чэмпіёны СССР дынамаўцы Кіева. Але толькі за дзве мінуты да канца сустрэчы ўкраінскім футбалістам удалося забіць адзіны пераможны мяч у вароты малодшых па класу спартсменаў.

Тым не менш спецыялісты, якія прысутнічалі на гэтай гульні, сцвярджаюць, што «Хімік» нядрэнна падрыхтаваўся да адкрыцця першынства краіны па футболу ў другой лізе.

СЯРОД ЛІДЭРАЎ

Шэсць гандбольных мужчынскіх каманд вышэйшай лігі правялі ў Мінску другі круг чэмпіяната Савецкага Саюза па ручному мячу.

Найбольш удала выступілі гаспадары пляцоўкі — СКА. Мінчане перамаглі армейцаў Кіева, рыжскі «Цэлтніекс» і каўнаскі «Гранітас». Ні адной гандбольнай камандзе, якія выступалі ў беларускай сталіцы, не ўдалося прайсці турнір без паражэнняў. У апошні дзень, напрыклад, беларускія спартсмены прайгралі аднаклубнікам з Львова два мячы (27:29).

Пасля другога круга мінчане дзеляць другое-трэцяе месцы ў першынстве краіны. На іх рахунку 23 ачкі. Наперадзе — ЦСКА (Масква), у якога на два ачкі больш.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:
МІНСК-5, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80; 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 372